ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 37-ы
№ 34 (2291)
26 красавіка 1968 г. ПЯТНІЦА
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

Хлеб юбілейнага года

Вясна — пара надзей, радасцей, здзяйсненняў. Для хлебароба вясна яшчэ і пара клопатаў. «Вясновы дзень год корміць», —спрадвеку гаворыць ён. Не ўпусціць гэтага дня, ашчадна скарыстаць кожную гадзіну, упару кінуць зерне ў раллю, абмытую грамовымі дажджамі, аблашчаную лагодным сонцам, — руплівца сёння хлебароб. Гэты ягоны веснавы клопат — клопат аб будучым ураджаі, аб будучых поўных засеках, аб будучым хлебе...

Ідзе па полі трактар, абуджаючы радасным рокатам наваколле. За трактарам — сеялка. Роўнымі шнурочкамі кладзецца за ёй у глебе зерне. Ідзе сяўба яравых. Такую карціну ўбачыш сёння ў кожным калгасе і саўгасе.

Гэты здымак фотакарэспандэнт БЕЛТА П. Наватараў зрабіў на полі племсаўгаса «10-годдзе БССР» Любаньскага раёна. На першым плане, за сеялкай — Алена Нядзельцава.

РАСЦЕ І РАСЦЕ...

Беларусь гарнцкая, Беларусь нафтавая, Беларусь хімічная — усё часцей мы чуем гэтыя словы. Новыя профілі беларускай індустрыі — гэта шахты і вышкі, цэхі і лабараторыі, гэта новыя тэхналагічныя працэсы і людзі, што авалодалі найскладанейшай тэхнікай.

Расце і расце адзін з флагманаў беларускай хіміі—Магілёўскі камбінат сінтэтычнага валакна. Першамайскае свята, 50-годдзе рэспублікі тут сустракаюць новымі вытворчымі перамогамі.

Фотакарэспандэнт К. Якубовіч зрабіў гэты здымак у адзін з веснавых дзён. На будаўнічай пляцоўцы Магілёўскага сінтэтычнага гарачая пара...

СХОД ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

23 красавіка адбыўся адкрыты сход партыйнай арганізацыі Саюза пісьменнікаў БССР.

Удзельнікі сходу заслухалі і абмеркавалі даклад сакратара Мінскага гаркома КПБ В. Лежапёкава «Пастанова ЦК КПБ «Аб 50-годдзі Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі» і задачы беларускай пісьменніцкай арганізацыі».

У спрэчках па дакладу выступілі Еўдакія Лось, Васіль Зуёнак, Пімен Панчанка, Георгій Шыловіч, Станіслаў Шушкевіч, Лазар Шапіра.

Сход аднадушна ўхваліў мерапрыемствы па падрыхтоўцы да 50-годдзя БССР і Кампартыі Беларусі.

ГОСЦЬ ШКОЛЫ — АРТЫСТ

У ленінскія дні старшакласнікі 74 мінскай школы запрасілі да сябе ў госці саліста Беларускага тэатра оперы і балета народнага артыста БССР А. Генералава, выканаўцу ролі Уладзіміра Ільіча Леніна ў оперы В. Мурадэлі «Кастрычнік».

Спявак расказаў, як працаваў над вобразам правадыра, прачытаў успаміны пра Леніна, А. В. Луначарскага. Школьнаму ленінскаму музею ён падарыў свае фотаздымкі ў ролі Ільіча.

Па просьбе школьнікаў госць выканаў некалькі арый і песень.

ДЛЯ НАС І БУДУЧЫХ ПАКАЛЕННЯЎ

Як лепш захаваць старажытныя помнікі гісторыі і культуры? Як упісаць іх у сучасны гарадскі пейзаж, каб яны «гучалі» ў адным ансамблі? Што трэба зрабіць, каб палепшыць работу Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры? Гэтым пытанням прысвечана работа III Пленума цэнтральнага савета таварыства, які сёння пачынае сваю работу.

Аб некаторых баках дзейнасці таварыства расказваецца ў артыкуле Ф. Барысевіча.

Другі год працуе Добраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры. У яго складзе сёння 1683 первічныя арганізацыі і 1560 калектыўных членаў — калгасаў, саўгасаў, прамысловых прадпрыемстваў і ўстаноў. Гэта шырока разгалінаваная арганізацыя дзейнічае поплеч з дзяржаўнай інспекцыяй па ахове помнікаў гісторыі і культуры Міністэрства культуры БССР.

Таварыства правяло ўжо значную работу, аказала мясцовым партыйным і савецкім органам, музеям, клубам, бібліятэкам дзейсную дапамогу ў выхаванні маладога пакалення на рэвалюцыйных і баявых традыцыях нашага народа, у захаванні для нашчадкаў лепшых помнікаў гісторыі, архітэктуры і культуры.

Абласныя аддзяленні таварыства разам з работнікамі дзяржаўнай інспекцыі і спецыялістамі выявілі за гэты час больш шасцідзесяці новых помнікаў архітэктуры XV—XIX стагоддзяў, якія маюць гістарычную каштоўнасць і варты таго, каб быць пад аховай дзяржавы. Усяго ўжо ў нас на ўліку 4 500 помнікаў культуры, архітэктуры, манументальнага жывапісу, археалогіі.

Але мала выявіць помнік, узяць яго пад ахову. Трэба клапаціцца, каб ён быў у добрым стане. У Мінскай вобласці, напрыклад, праверылі помнікі, якія былі ўзяты пад ахову раней. Выявілася, што Успенская царква і касцёл Пятра і Паўла ў вёсцы Новы Свержань Стаўбцоўскага раёна, якія арандуюцца калгасам «Краіна Саветаў», запушчаны і даўно не рамантаваны. Праўленне калгаса абавязалася за вясну і лета паправіць будынкі, добраўпарадкаваць тэрыторыю вакол гэтых помнікаў архітэктуры XVI стагоддзя. Прыступае да рамонту палаца Радзівіла (XIX ст.) арандатар будынка — племзавод «Чырвоная зорка» Клецкага раёна. У палацы будзе летні піянерскі лагер, гасцініца, саўгасны медпункт. Такую ж работу праводзіць таварыства і ў іншых абласцях.

Сёлета будуць перааформлены «Ахоўныя абавязацельствы» з усімі арандатарамі. Прадпрыемствы, арганізацыі і ўстановы, якія маюць на сваім балансе будынкі-помнікі, павінны будуць у бліжэйшыя адзін-два гады добраўпарадкаваць іх. Да 1970 года намечана адрамантаваць 22 буйнейшыя помнікі архітэктуры рэспублікі, у тым ліку Сафійскі сабор у Полацку, Мікалаеўскую царкву ў Магілёве, Каложскую ў Гродна, Прэабражэнскую ў Заслаўлі.

1967 год быў асабліва плённы на даследчую і следапытніцкую работу. Сталі вядомыя многія падзеі з гераічнага мінулага беларускага народа, намнога зменшылася колькасць безымянных магіл. Толькі за леташні год на магілах воінаў і партызан было ўстаноўлена больш за чатырыста помнікаў, абеліскаў. Велічныя і прыгожыя манументы ўзведзены, напрыклад, на Бабруйскім фанерадрэваапрацоўчым камбінаце, у калгасе імя Кірава Бабруйскага, імя Леніна Віцебскага, імя Чапаева Глыбоцкага раёнаў.

Летась сярод первічных арганізацый таварыства Мінскай, Брэсцкай і Магілёўскай абласцей быў аб'яўлены конкурс, які меў на мэце палепшыць прапаганду нашай рэвалюцыйнай і баявой славы, шырэй разгарнуць рух следапытаў, дамагчыся ўзорнага ўтрымання помнікаў. Можна ўжо шмат расказаць пра яго здабыткі. Ва ўсіх трох абласцях помнікі рэвалюцыйнай і баявой славы замацаваны за первічнымі арганізацыямі таварыства, школамі, калгасамі, установамі.

Члены маладзёжнай секцыі таварыства Магілёва на сродкі ад рэалізацыі сабранага металалому рашылі пабудаваць каля школы № 1 помнік былому вучню Герою Савецкага Саюза Леаніду Лорчанку. Яшчэ раней школьнікі добраўпарадкавалі магілу героя ў вёсцы Буда Бялыніцкага раёна, устанавілі на ёй абеліск. Шануюць памяць сваіх былых вучняў у Магільнянскай і Лашанскай школах Уздзенскага раёна, дзе ўстаноўлены мемарыяльныя дошкі з імёнамі навучэнцаў, што загінулі ў баях з фашызмам.

Члены маладзёжных секцый таварыства ў Маларыцкім, Ляхавіцкім, Бярозаўскім і некаторых іншых раёнах Брэсцкай вобласці ўстанавілі імёны 14 тысяч раней невядомых воінаў і партызан, якія загінулі ў гады Айчыннай вайны. У вёсцы Фядоры Столінскага раёна школьнікі вярнулі з невядомасці 128 імёнаў савецкіх воінаў, што загінулі, вызваляючы вёску ў 1944 годзе. Летась больш ста сваякоў загінуўшых наведалі Фядоры. Трэба было бачыць, як сардэчна дзякавалі яны вучням за іх высакародную, самаадданую работу.

Лагойскае раённае аддзяленне таварыства сумесна з райкомам камсамола арганізавалі трохдзённы паход па месцах былых партызанскіх баёў. У час паходу праводзілі сходы і мітынгі, чыталі лекцыі і даклады, ускладалі вянкі на магілы загінуўшых.

Члены Брэсцкага абласнога таварыства пачалі аднаўляць партызанскія зямлянкі каля вёскі Байкі, дзе ў 1942—1943 гадах былі падпольная друкарня і Брэсцкі падпольны антыфашысцкі камітэт. Па хадайніцтву таварыства аблвыканком прыняў рашэнне ўзвесці помнік эхвярам фашызму ля вёскі Плоскі, дзе былі расстраляны каля васьмі тысяч вязняў Брэсцкай турмы. Мінскае абласное таварыства падрыхтавала дакументацыю на аднаўленне партызанскіх зямлянак у Салігорскім і Мядзельскім раёнах, дзе знаходзіліся Мінскі і Вілейскі падпольныя абкомы партыі.

Займаецца таварыства і выдавецкай дзейнасцю, папулярызацыяй помнікаў гісторыі і культуры ў друку. У выдавецтве «Полымя» намечана выпусціць даведнікі пра помнікі архітэктуры, археалогіі, рэвалюцыйнай і баявой славы. Але трэба шчыра прызнаць, што гэтая работа праводзіцца ў рэспубліцы ўсё яшчэ слаба. Пажадана, каб нашы вучоныя, пісьменнікі, дзеячы культуры праз перыядычны друк, радыё і тэлебачанне шырэй прапагандавалі творы манументальнага жывапісу, помнікі архітэктуры, археалогіі, баявой і рэвалюцыйнай славы, прапагандавалі ленінскія адносіны да культурнай спадчыны.

Трэба нам яшчэ больш расшыраць і ўмацоўваць свае рады. Да 50-годдзя рэспублікі членамі таварыства стануць новыя сотні тысяч працоўных, больш тысячы калгасаў, саўгасаў, прадпрыемстваў. Гэта дазволіць значна павялічыць размах работы, больш паспяхова рашаць задачы па ахове і прапагандзе культурнай спадчыны нашага народа.

Ф. БАРЫСЕВІЧ,
намеснік старшыні прэзідыума Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры.

«ПОЛЫМЯ» — ГОСЦЬ МАСКВЫ

23 красавіка на пасяджэнні Савета па беларускай літаратуры пры Саюзе пісьменнікаў СССР адбылося абмеркаванне старэйшага беларускага грамадска-палітычнага і літаратурна-мастацкага часопіса «Полымя».

— Сустрэча пісьменнікаў, работнікаў выдавецтваў, рэдакцый газет і часопісаў Масквы з калектывам «Полымя» праходзіць у знамянальны час: пасля красавіцкага Пленума ЦК КПСС, напярэдадні 50-годдзя Беларускай Савецкай Рэспублікі,—сказаў, адкрываючы пасяджэнне, старшыня Савета па беларускай літаратуры Я. Мазалькоў.

З паведамленнем аб рабоце часопіса выступіў галоўны рэдактар «Полымя» П. Кавалёў. Ён расказаў, якія творы былі апублікаваны на старонках часопіса за апошнія паўтары гады, падзяліўся планамі работы на бліжэйшы час.

Д. Кавалёў у сваім выступленні гаварыў пра паэмы «Волхаўская споведзь» М. Аўрамчыка, «Куфар» Л. Геніюш, «Слёзы Раданы» К. Кірэенкі, «Заазер'е» А. Вярцінскага, якія былі апублікаваны ў «Полымі».

— Наўрад ці гэтыя творы можна назваць паэмамі ў класічным разуменні,—сказаў Д. Кавалёў. — Некаторыя з іх хутчэй вялікія вершы, драбнаватыя па зместу і не вельмі дасканалыя па форме. У «Заазер'і», напрыклад, А. Вярцінскаму ўдалося перадаць смутак сына аб заўчасна памёршай маці. Але самой маці, яе спраў і людзей, з якімі яна пражыла нялёгкае жыццё, мы, на жаль, не бачым у паэме. У асобных творах пераважае пераказ падзей, апісальніцтва.

Аб беларускай паэзіі на старонках «Полымя» гаварылі таксама Я. Хелемскі, П. Сямынін, Г. Куранёў, Ю. Саенка.

— Вялікай удачай часопіса «Полымя» з'яўляецца публікацыя «Лісткоў календара» М. Танка,—гаварыў маскоўскі празаік Л. Лагін. — Я не толькі глыбей пазнаёміўся з Танкам, як з паэтам і грамадзянінам, але і шмат даведаўся аб жыцці і барацьбе працоўных былой Заходняй Беларусі, аб культуры і побыце беларускага народа. Хочацца, каб «Лісткі календара» ў бліжэйшы час выйшлі асобнай кнігай на роднай і рускай мовах.

А. Гатаў, Я. Хелемскі і іншыя высока ацанілі пераклад паэмы Лермантава «Мцыры», які зрабіў А. Куляшоў. Гэта сапраўдны ўклад у беларускую паэзію, адзначалі яны. Пераклад Куляшова вылучаецца высокім майстэрствам, тонкай перадачай лермантаўскай вобразнасці, гаварыў, у прыватнасці, А. Гатаў. На гэтым прыкладзе, падкрэсліў ён, мы бачым, як пераклад твораў класічнай літаратуры ўзбагачае тую літаратуру і мову, на якую яны перакладаюцца. Маскоўскія літаратары высока ацанілі таксама пераклады Я. Семяжона, Ю. Гаўрука, Ул. Дубоўкі, якія былі надрукаваны ў «Полымі».

Толькі ў 1967 годзе часопіс «Полымя» пазнаёміў сваіх чытачоў з творамі 65 пісьменнікаў народаў СССР і зарубежных краін. Усе ўдзельнікі абмеркавання выказалі пажаданне, каб часопіс і надалей працягваў і памнажаў гэтую добрую традыцыю.

Пра раманы і аповесці М. Лобана, А. Савіцкага, І. Пташнікава, А. Васілевіч, М. Лужанініна, А. Карпюка, пра апавяданні, з якімі чытач у апошні час пазнаёміўся на старонках «Полымя», гаварылі маскоўскія і ленінградскія пісьменнікі Д. Осін, А. Астроўскі, Я. Мазалькоў, М. Гарбачоў і іншыя.

З аглядам літаратуразнаўчых і крытычных артыкулаў, а таксама рэцэнзій, апублікаваных у «Полымі», выступіў крытык А. Уласенка.

Загадчык рэдакцыі мастацкай літаратуры выдавецтва «Беларусь» А. Бажко расказаў прысутным пра кнігі, якія выдавецтва рыхтуе да 50-годдзя Беларускай рэспублікі. Ленінградскі пісьменнік і перакладчык беларускай літаратуры П. Кабзарэўскі паінфармаваў удзельнікаў пасяджэння аб тым, якія творы беларускіх пісьменнікаў будуць апублікаваны ў гэтым годзе на старонках ленінградскіх часопісаў, а С. Кір'янаў — якія кнігі беларускіх аўтараў пабачаць свет у выдавецтве «Советский писатель».

У пасяджэнні Савета па беларускай літаратуры прынялі ўдзел супрацоўнікі часопіса «Полымя» Б. Сачанка, Р. Шкраба, І. Чыгрынаў, А. Клышка, першы сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі М. Танк, загадчык аддзела культуры ЦК КПБ С. Марцалеў.

Гаворка аб часопісе «Полымя» вылілася ў гаворку аб сучасным стане беларускай літаратуры, аб традыцыях і наватарстве, аб творчасці маладых беларускіх пісьменнікаў, аб перакладах лепшых твораў беларускіх паэтаў і празаікаў на рускую мову.

ЗАПРАШАЮЦЬ «МАСКОЎСКІЯ ЗОРКІ»

Маляўнічыя афішы запрашаюць масквічоў і гасцей сталіцы на традыцыйны вясновы фестываль «Маскоўскія зоркі». Ён адкрыецца 5 мая ў Вялікім тэатры балетам «Спартак», а закончыцца 13 мая вялікім канцэртам у Крамлёўскім Палацы з'ездаў.

Маладым лаўрэатам у час фестывалю будуць аддадзены лепшыя залы сталіцы. У Вялікай зале кансерваторыі выступіць пераможца трох міжнародных конкурсаў 25-гадовы піяніст, педагог Маскоўскай кансерваторыі Аляксей Наседкін. У Генуі (Італія) на конкурсе імя Паганіні ўсе чатыры маладыя савецкія скрыпачы дабіліся поспеху: з шасці прызоў яны заваявалі чатыры. Першую прэмію атрымаў 22-гадовы студэнт Маскоўскай кансерваторыі Рыгор Жыслін. 11 мая ён выступіць у канцэрце ў Вялікай зале кансерваторыі.

Савецкую вакальную школу разам з вядомымі майстрамі старэйшага пакалення будуць прадстаўляць маладыя оперныя спевакі, якія ўжо заваявалі прызнанне: Т. Мілашкіна, Е. Абразцова, В. Атлантаў, Д. Каралёў, Ю. Мазурок. Канцэрты дадуць папулярныя артысты з саюзных рэспублік — В. Нарэйка і Э. Канява (Літоўская ССР), Х. Крум (Эстонская ССР).

У Крамлёўскім Палацы з'ездаў адбудуцца канцэрты ансамбляў танца Беларусі і «Бярозкі», Чырванасцяжнага ансамбля песні і танца Савецкай Арміі.

Аматары цырка ўбачаць праграму пад назвай «Заўсёды ў дарозе» з удзелам вядомых комікаў Карандаша і А. Папова, у Эстрадным тэатры — спектаклі Ленінградскага тэатра мініяцюр пры ўдзеле А. Райкіна, а таксама канцэрты І. Кабзона і Г. Веліканавай.

Праграму фестывалю паведаміла савецкім і замежным журналістам міністр культуры СССР К. Фурцава на прэс-канферэнцыі, якая адбылася 24 красавіка.

СВЯТОЧНЫЯ ПРЭМ'ЕРЫ

Дом культуры аршанскіх чыгуначнікаў ветліва прымае гасцей. Тут штодзень адбываюцца святочныя першамайскія вечары.

Самадзейныя калектывы Дома культуры — хор, народны тэатр, эстрадны і духавы аркестры, танцоры, чытальнікі, салісты-спевакі, аматарская кінастудыя падрыхтавалі да свята новыя праграмы.

Артысты народнага тэатра паказалі прэм'еру «Меч і зоркі» Ю. Чапурына (рэжысёр Алег Калабанаў). Спектакль расказвае пра гераічныя дні Вялікай Айчыннай вайны. У ім удзельнічае Алена Кардоўская — маці героя-партызана Жэні Коржаня, які быў ад'ютантам Канстанціна Заслонава. У спектаклі занятыя таксама ветэраны самадзейнасці машыніст паравознага дэпо Аляксандр Снітко, дзяжурны станцыі Орша -Цэнтральная Максім Матросаў і іншыя.

Кінааматары стварылі новы фільм «Ніхто не забыты і нішто не забыта», прысвечаны баявым справам і мірным будням заслонаўцаў. Студыя аршанскіх чыгуначнікаў (кіраўнік інжынер дыстанцыі сувязі Антон Шапчыц аб'ядноўвае цяпер каля 30 кінааматараў.

□

Сёння ў Маладзечанскім Доме культуры адбудзецца ўрачысты вечар прадстаўніноў грамадскасці горада. Святочны канцэрт падрыхтаваў Народны ансамбль песні і танца. У праграме — песні і танцы аб Радзіме, партыі, міры, лірычныя і жартоўныя песні. Будуць выкананы новыя творы кампазітара Іосіфа Сушко. Танцавальная група ансамбля (балетмайстар Анатоль Кудраўцаў) пакажа некалькі новых нумароў.

Народны тэатр гарадскога Дома культуры ў майскія дні пакажа камедыю В. Катаева «Дзень адпачынку».

Будні архітэктараў

БУДУЕЦЦА ВЁСКА

Сёлета ў чэрвені ў Мінску мае адбыцца Усесаюзная нарада па сельскаму будаўніцтву. Пытанні падрыхтоўкі да гэтай нарады абмяркоўваліся на пашыраным пленуме праўлення Саюза архітэктараў БССР. А цяпер у майстэрнях поўным ходам ідзе работа.

Віцебскія архітэктары правялі абмеркаванне праектаў планіроўкі саўгаса «Салюты».

У Магілёве і Брэсце прайшлі нарады па сельскаму будаўніцтву, у час якіх былі наладжаны спецыяльныя архітэктурныя выстаўкі. З аналізам праблем сельскага будаўніцтва выступалі архітэктары з Мінска.

Гродзенскія архітэктары ўзялі шэфства над распрацоўкай планіровачных рашэнняў калгасаў і саўгасаў. Яны распаўсюдзілі рэкамендацыі па кааперным вырашэнню асобных будынкаў і цэлых комплексаў, зрабілі праектныя прапановы па будаўніцтву камбінатаў бытавога абслугоўвання на сяле.

Саюз архітэктараў рэспублікі і Мінскае абласное ўпраўленне будаўніцтва і архітэктуры рыхтуюць конкурс па сельскаму будаўніцтву.

У Мінскім Доме архітэктара прайшоў семінар раённых архітэктараў і інспектараў па дзяржаўнаму архітэктурна-тэхнічнаму кантролю Мінскай вобласці. На гэтым семінары абмеркаваны пытанні павышэння якасці сельскага будаўніцтва, праекты новых жылых і адміністрацыйных будынкаў для сельскай мясцовасці.

Члены секцыі сельскага будаўніцтва Саюза архітэктараў БССР здымаюць кінафільм аб забудове вёскі.

МАНУМЕНТЫ СЛАВЫ

Віцебскі аблвыканком разгледзеў і ўхваліў шэраг праектных прапаноў архітэктараў З. Озераваи і А. Бельскага па стварэнню помнікаў баявой славы на тэрыторыі вобласці. Аўтарам прапаноў зроблены канкрэтныя заўвагі і выказаны пажаданні, згодна з якімі яны працягваюць працу над праектамі.

КОРАТКА

Учора ў Мінску закончыўся трохдзённы семінар па навуковай арганізацыі працы і кіраванню вытворчасцю ў праектных арганізацыях, скліканы Мінскім абкомам КПБ, Дзяржбудам БССР і Усесаюзным навукова-метадычным цэнтрам па арганізацыі працы і кіраванні вытворчасцю.

Разгледжаны пытанні выкарыстання вылічальнай тэхнікі ў праектных работах, рацыянальнай і эстэтычнай арганізацыі рабочых месц праекціроўшчыкаў, сацыяльна-псіхалагічныя праблемы навуковай арганізацыі працы і інш.

□ У памяшканні Мінскага Дома архітэктара адкрылася выстаўка жывапісных і акварэльных работ архітэктара А. Еўтушэнкі. У экспазіцыі — пейзажы, партрэты, замалёўкі на архітэктурныя матывы.

□ Беларускія архітэктары сустрэліся з рэжысёрам Мінскай студыі навукова-папулярных і храніхальна - дакументальных фільмаў І. Вейняровічам. Рэжысёр расказаў аб творчых пошуках кінадакументалістаў. Пасля гутаркі адбыўся прагляд новага фільма Мінскай студыі «Генерал Пушча».

□ Праўленне Саюза архітэктараў БССР прыняло рашэнне ўстанавіць у Мінску мемарыяльную дошку ў памяць архітэктара Парусніка, які ўнёс значны ўклад у пасляваенную рэканструкцыю сталіцы рэспублікі.

ЗА КРУГЛЫМ СТАЛОМ

Тэорыі і практыцы архітэктурнай творчасці была прысвечана размова за круглым сталом у Мінскім Доме архітэктара. Абмяркоўвалася пытанне аб нацыянальных асаблівасцях і спецыфіцы архітэктурнага вобраза. У спрэчках выступілі Ю. Патапаў, В. Калнін, А. Занеўскі, Т. Тубіш, Д. Кудраўцаў і інш. Удзельнікі дыскусіі гаварылі аб даследаванні нацыянальных асаблівасцей архітэктуры, аб выразнасці архітэктурных рашэнняў, пашырэнні правоў архітэктараў і г. д.

Многія праекты застрэйкі зон адпачынку распрацаваны ў майстэрнях «Белдзяржпраекта». Галоўны інжынер праекта Станіслаў Шаціла, старшы архітэктар Нэлі Цямнова і архітэктар Уладзіслаў Таліцкі, якіх вы бачыце на здымку, праектуюць зараз другую чаргу піянерскага лагера «Зубронак» і турысцкую базу на беразе Нарачы.

Фота Ул. КРУКА.

БЕЛАРУСКІ АСІЛАК

У Дзяржаўным музеі БССР сярод шматлікіх экспанатаў ёсць два цікавыя дакументы. Адзін з іх, датаваны 1964 годам,—заказ-нарад на пастаўку ў Індыю і В'етнам самазвалаў маркі «БелАЗ» Жодзінскага аўтамабільнага завода. Другі—пісьмо штабу перакрыцця ракі Енісей на будаўніцтве Краснаярскай ГЭС калектыву гэтага завода. Названыя тры адрасы—толькі маленькая частка тых пунктаў на карце зямнога шара, дзе працуюць сёння беларускія волаты-самазвалы.

Зараз у эксперыментальным цэху завода распачата зборка першага 75-тоннага самазвала. На ім будзе ўстаноўлен рухавік магутнасцю 850 конскіх сіл. Новы беларускі волат будзе мець даўжыню каля 10 метраў, шырыню—каля 5 метраў, вышыню калёс—2,5 метра. Упершыню ў практыцы айчыннага машынабудавання ў новай мадэлі выкарыстана незалежная падвеска ўсіх калёс, электрычная трансмісія і г. д.

Такі падарунак жодзінскіх аўтазаводцаў да слаўнага юбілею рэспублікі. Пройдзе час, і 75-тонны асілак адправіцца на работу—у кар'еры, руднікі—па дарогах многіх краін.

А ў заводскіх канструктараў ужо новая задума: за пісьмовымі сталамі і кульманамі нараджаецца аўтасамазвал грузападымальнасцю 100 тон.

Вы бачыце адзін з куткоў эксперыментальнага цэха завода. Ідзе зборка 75-тоннага «БелАЗа».

Фота П. НАВАТАРАВА (БЕЛТА)

ЎЧОРА І СЁННЯ СТАРЫХ ЦЯРУШАК

ЗАБВІНАВАЎЧАГА акта таварыша пракурора Мінскага акруговага суда аб сутыкненні сялян вёскі Старыя Цярушкі Слуцкага павета з паліцыяй.

«...9 сакавіка 1907 г. прыстаў 1-га стану Слуцкага павета Міхаіл Грунтовіч у суправаджэнні паліцэйскага ўрадніка Піліпа Фіньковіча, 15 конных і пешых паліцэйскіх стражнікаў памешчыка Мар'яна Карказовіча, яго лясной варты і іншых прыбыў у в. Цярушкі Пагосцкай воласці для таго, каб знайсці і адабраць лес, украдзены сялянамі гэтай вёскі ў памешчыка Карказовіча і ў купцоў Зельдавіча і Шыка, якія купілі ў яго лес.

Абшукаўшы крайнія двары сялян Гаўрылы Пранчука, Дзям'яна Яфімчыка, Кузьмы Серавокага і іншых і знайшоўшы ў іх украдзены будаўнічы лес і шпалы з кляймом, якія былі апазнаны Карказовічам і даверанымі купцоў Шыка і Зельдавіча, Грунтовіч распарадзіўся ўвесь знойдзены лес скласці на падводы і ў суправаджэнні 4-х конных стражнікаў адправіць яго на захаванне ў маёнтак Карказовіча.

У час вобыску на вуліцы сталі збірацца сяляне, і колькасць іх, нягледзячы на неаднаразовыя патрабаванні разысціся, усё павялічвалася. Убачыўшы, што сяляне затрымалі апошнюю падводу і, акружыўшы яе, адвязваюць бервяно, якое ляжала на ёй, ураднік Фіньковіч паспяшаўся да падводы і стаў зноў прывязваць яго, але сяляне, у тым ліку Рыгор Яфімчык і Ганна Каліновік, супраціўляліся гэтаму і, вырываючы з рук яго вяроўку, сталі скідваць бервяно з саней.

Таму што натоўп усё больш павялічваўся і вызваліць падводу не было ніякай магчымасці, дык Фіньковіч, пакінуўшы яе, адправіўся да прыстава і апошні, даведаўшыся аб здарэнні, загадаў стражнікам разагнаць натоўп. Ледзь прыстаў са стражнікамі наблізіўся да таго месца, дзе была затрымана падвода, як з натоўпу сялян, якіх разам з жанчынамі і дзецьмі сабралася каля 500 чалавек, паляцелі ў іх каменне, палкі, калы, з-за чаго спалоханыя коні стражнікаў паевярнулі назад. У натоўпе ў гэты час раздаваліся крыкі: «Бі іх!», «Вы не маеце права забіраць дрэва!», «Мы вам пакажам, як рабіць вобыскі!».

Ачомаўшыся, стражнікі зноў рушылі на натоўп, але сустрэтыя градам камення і палак, вымушаны былі адступіць, прычым некалькі палак трапіла ў прыстава Грунтовіча, ураднікаФіньковіча і стражнікаў Рыгора Варвашэню, Мікалая Пракаповіча, Уладзіміра Бянько і інш.

Сяляне не пераставалі цясніць стражнікаў і асыпаць іх палкамі і каменнем, і прыстаў загадаў зарадзіць ружжо і зрабіць некалькі стрэлаў, адным з якіх, як аказалася пазней, быў паранены ў нагу селянін Сямён Рабы.

Адступіўшы за вёску, прыстаў Грунтовіч разам са стражнікамі і асобамі, якія яго суправаджалі паехаў...»

Старыя Цярушкі... Дабірацца да іх са сталіцы цяпер проста. Можна аўтобусам і таксіст не адмовіцца—дарога готкая. Можна і спадарожнымі. Людзі на Палессі не праедуць міма, каб не ўзяць чалавека...

Старыя Цярушкі... Звычайная вёска. Глядзяць на вуліцу чыстымі вокнамі нішто сабе дамы пад шыферам і бляхай. І, як усюды, лепшы і прыгажэйшы будынак школы-дзесяцігодкі. А яшчэ ёсць у Старых Цярушках бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, паштовае аддзяленне, камбінат бытавога абслугоўвання...

Першым, з кім давялося сустрэцца ў вёсцы, быў Васіль Андрэевіч Яфімчык, цярушкавец, хаця зараз тут і не жыве. У раённым упраўленні сельскай гаспадаркі аддзелам кадраў загадвае. Але лічыць сябе Васіль Андрэевіч цярушкаўцам. Тут ён некалі арганізоўваў бібліятэку. Пасля вайны было гэта. Хто кнігу прынясе, хто—часопіс. Расла бібліятэка. Потым яе загадчыка накіравалі ў партыйную школу. А пазней узначальваў у роднай вёсцы сельскагаспадарчую арцель. Таму ўсё яму ў Цярушках вядома. І хто каму сваяком, і хто з якой сям'і.

Паказваю Васілю Андрэевічу архіўныя дакументы, і што ж вы думаеце—ён памятае сялян, якія названы ў іх, і з нашчадкамі гэтых сялян знаёмы. Пазней я даведаўся, што мой «гід» таксама з таго ваяўнічага роду.

Я хаджу па вёсцы, знаёмлюся з людзьмі. Які шкавы іх лёс... Пётр Уладзіміравіч Каліновіч. Так, сын той самай Ганны Каліновік, што ўспамінаецца ў «абвінаваўчым акце». Пажылы ўжо чалавек. Сур'ёзны, не ўсміхнецца, калі і пра смешнае расказвае, хіба толькі ў вачах прамільгне іскрынка.

Ён расказвае, і я ўяўляю, як прыйшоў з вайны салдат, у разбураную вёску. Хлебаробы выбралі Пятра старшынёй калгаса. Каля 15 гадоў прабыў ён на гэтай пасадзе. Тут жа ў сельгасарцелі «Усход» працуе і яго сястра Вольга. Лепшая свінарка. З усяго раёна ездзяць да яе вучыцца.

Разам з Пятром быў на фронце і брат Міхаіл. Усе грудзі ў ордэнах і медалях. Толькі, калі перашпільвае іх на новы гарнітур, прыходзіцца прасіць дапамогі. Аднаруч не справіцца. Але не любіць Міхаіл Уладзіміравіч, каб яго называлі інвалідам. Крыўдзіцца. Салдат не пакідае строю. Ужо каторы год яго выбіраюць сакратаром парткома аднаго з бабруйскіх заводаў.

Пабываў я і ў хаце Мікалая Пранчука — унука Гаўрылы-першага, у каго стражнікі абшукалі двор. Мікалай ганарыцца сваім дзедам. А яшчэ больш бацькам Мікалаем Гаўрылавічам, удзельнікам рэвалюцыі 1917 года.

У глухую палескую вёску, расказваюць, ён першы прынёс вестку аб тым, што ў Піцеры скінулі Часовы ўрад. Мікалай расказваў пра Леніна, пра бальшавікоў. Быў хлопец сапраўдным вясковым завадатарам, адным з першых уступіў у калгас. У час Айчыннай вайны стаў Мікалай Гаўрылавіч смелым партызанскім сувязным. Ды чыясьці чорная душа прадала патрыёта. Яго схапілі. Думалі, што завядзе да партызан, пакажа іх лагер. Але ён кінуў у твар гітлераўцам:

— Ні адзін з вас не вынесе ног з нашай зямлі.

Гэта былі яго апошнія словы. Ва ўсіх атрадах і групах, ва ўсіх сёлах партызанскай зоны былі праведзены мітынгі, прысвечаныя светлай памяці Пранчука.

А вось лёс прадстаўнікоў трэцяга пакалення, нашчадкаў былых цярушкінскіх бунтароў. Гэта ўнукі Сямёна Рабага. Адзін з іх—Іван—воін Савецкай Арміі, Мікалай і Адам працуюць на Першым калійным. Васіль—будаўнік—працуе таксама ў Салігорску. Іх дзед быў непісьменны. А ўнукі кіруюць складанымі горнымі машынамі, будуюць цудоўны горад-прыгажун.

І яшчэ адна, мне здаецца, самая цікавая сустрэча.

Пра Кузьму Серавокага цярушкаўцы расказвалі, што калі ішоў ён да ўрача, дык у канцы прыёму абавязкова даставаў з кішэні грошы. Кожны раз урач вельмі бянтэжыўся. Бянтэжыўся і пацыент. Мармычучы нешта пад нос, ён хуценька хаваў грошы і доўга дзякаваў...

Што ж будзеш рабіць, — звычка. Даўняя, шматгадовая звычка. Ці многа, ці мала, а пражыў Кузьма Серавокі акурат паўвека ў Злучаных Штатах Амерыкі. Паехаў туды шукаць лепшай долі ў 1908 годзе.

Доўга расказваць пра заморскае жыццё селяніна з Цярушак. Скажу толькі, што батацця там ён не нажыў. А калі, раптам, пачалі падводзіць вочы, дык зусім стала—хоць у шворку. Дзесяць гадоў назад падказалі добрыя людзі паехаць да савецкага пасла, каб той дапамог вярнуцца на радзіму. Так і зрабіў. У той дзень здалося Мікалаю Серавокаму, што пачуў ён песню беларускага салаўя, звон касы на лузе, убачыў роднае неба над галавой...

Неўзабаве Цярушкі сустракалі зямляка. Толькі самыя старыя памяталі яго. А ён? Мо і пазнаў бы, ды прыехаў дзед амаль сляпы.

І вось першая сустрэча з урачом-спецыялістам. Той сказаў, што трэба класціся ў бальніцу. Стары замахаў рукамі: «Божа літасцівы, дзе ж я грошы вазьму?»...

Растлумачылі яму, што ў нас лячэнне бясплатнае. Паверыў і не паверыў... І ў бальніцы пасля кожнага прыёму лекаў з апаскай цікавіўся: «І гэта за так?»

Вылечылі Мікалая Серавокага. Упершыню за многа гадоў зноў убачыў ён людзей, ды якіх—родных і блізкіх сэрцу.

...Ніводзін сход, ніводная ўрачыстасць у калгасе, не абыходзіцца без Мікалая Лаўрэнцьевіча Серавокага. Сядзіць ён звычайна ў першым радзе і ўважліва слухае. І твар старога ў гэтыя хвіліны ўрачысты і святочны. Ого, ён такі цярушкаўскі патрыёт! Цікавіцца справамі калгаса, і хто як працуе, і дзе хто вучыцца... А незнаёмаму абавязкова раскажа, што сын яго адназяскоўца Іосіфа Гідрановіча—Віктар—стаў вучоным, кандыдатам навук, Рыгор Серавокі—заслужаным хірургам, былы трактарыст Аляксей Галаваты — палкоўнікам....

...Позна вяртаўся я са Старых Цярушак. У расчыненае акно машыны вецер даносіў з поля прэлы пах зямлі. Дарога павярнула, і перад вачыма ў густой цемры веснавой ночы зноў прамільгнула некалькі электрычных ланцужкоў. У Старых Цярушках кіпела жыццё.

У. ЗАСЛАВЕЦ.

МІНСКІ, ПАЭТЫЧНЫ...

1936 ГОД. ЛЮТЫ. Мінск... Тут, у беларускай сталіцы, працуе скліканы з ініцыятывы Горкага Трэці пленум праўлення ССП. І цэлы тыдзень, з 10 па 16, горад жыве Паэзіяй, радасцю першых сустрэч з яе славутымі, дагэтуль толькі па імёнах знаёмымі творцамі: «Глядзіце—Ціханаў... А той, каржакаваты, побач з ім—ці не Тыцыян Табідзе?.. Дзяўчаты, Уткін! От жа прыгожы!..» Гордасць, любоў, захапленне...

Чаму пленум сабраўся іменна ў Мінску?

Напярэдадні, у Маскве, пры абмеркаванні тэзісаў даклада А. Суркова «Аб савецкай паэзіі», Усевалад Іванаў сказаў: «Гэта будзе размова Савецкай краіны пра мастацтва, размова на граніцы з Захадам».

Так—і зусім не фігуральна, а ў самым простым сэнсе слова—савецкая літаратура выходзіла на **пярэдні край**. Да самых кардонаў. Пад Негарэлае. І пагранічча выйшла насустрач сваім пісьменнікам.

— Ад імя тых, хто ў ясныя сонечныя дні і ў глухія асеннія ночы, пад праліўным дажджом і ў лютыя маразы вартуюць спакой нашых граніц, перадаю вам, майстрам мастацкага слова, баявое чэкісцкае прывітанне,— звярнуўся да пленума малады чалавек у зялёнай шапцы, т. Бічэўскі.

І яму гучна апладзіравалі і «кволая папутніца» (аднойчы яна сама сябе так назвала) Вера Інбер, і высачэзны, з ордэнам Баявога Чырвонага Сцяга, камкор і пісьменнік Роберт Эйдэман, і худы, зусім яшчэ маладзенькі Сярожа Міхалкоў, і мажны, сівагаловы Шалва Дадзіяні... «Таварышы, мы будзем разам у гадзіну трывог, у часы небяспекі»,—ад імя ўсіх запэўніў беларускага пагранічніка Уладзімір Кіршон, і зала яшчэ раз выбухнула авацыяй.

Блізкасць варожага буржуазнага Захаду ўвесь час адчуваласа на пленуме. Нібы хмара згусцілася над галовамі, калі А. Суркоў зачытаў радкі з адрасаванага яму горкаўскага пісьма: «Перад намі—непазбежнасць нападу ворагаў, перад намі—небывалая па размаху вайна...»

Пленум праходзіў пад знакам сцверджанага Першым пісьменніцкім з'ездам высокага погляду на савецкую літаратуру як на дзейсную зброю ў змаганні са старым светам, за «гуманізм рэвалюцыйнага пралетарыяту, гуманізм сілы, заклікані гісторыяй вызваліць... працоўных ад зайздрасці, подкупу, ад усіх брыдот, што на працягу стагоддзяў скажалі людзей працы» (М. Горкі).

МІНСКІ ПЛЕНУМ звязвала са з'ездам ідэя адзінства і разнастайнасці **шматнацыянальнай** савецкай літаратуры. На з'ездзе гэта ідэя прагучала як адкрыццё, як упершыню пазнаная ісціна, пленум жа канкрэтызаваў яе, зрабіў сваёй «рабочай формулай»: тут былі выслуханы два (акрамя асноўнага, пра паэзію) даклады — М. Клімковіча «Літаратура Савецкай Беларусі» і А. Тагірава «Башкірская савецкая літаратура».

Са шчырай павагай да беларускай літаратуры, з добрым веданнем яе выступалі многія вядомыя рускія пісьменнікі: Ул. Бахмецьеў гаварыў пра яе дэмакратычныя традыцыі, увасобленыя ў творчасці Купалы, Коласа і Бядулі; Ул. Лідзін—пра маладую прозу, у прыватнасці, пра элементы сапраўды раманнага эпасу ў кнігах Галавача; перакананы «сюжэтнік» Б. Ясенскі—пра «Тэорыю Каленбрун» Самуйлёнка.

З нечаканага боку падышоў да беларускай літаратуры Мікалай Асееў, паэт, які праз усё жыццё пранёс надзвычайную цікавасць да першапачатковай моўнай свежасці народнай песні, летапісу, быліны.

— Я з агромністым хваляваннем падымаюся на гэту трыбуну,—пачаў Асееў.— Гэта хваляванне з'яўляецца вынікам выключнага стану паэзіі, той замілаванасці, з якой яе сустрэла Беларусь, таго адчування, што я прыехаў не ў госці, а да родных, у родную сям'ю. І ў гуках мовы гэтай краіны... я чую значнасць маёй прафесіі. Я пазнаю ва ўкраінскай, беларускай мовах нейкія карэнні слоў, што сніліся мне ў маленстве, нейкія засытыя мною прывычкі той праўдзівай мовы... на якой размаўлялі народы, а не праслойка паэтычнай інтэлігенцыі, у якой мы выхоўваліся.

І далей—пераход да творчасці аднаго беларускага паэта, з вершамі якога ён, Асееў, пазнаёміўся ў Мінску—спачатку з чужога голасу, а потым—захапіўшы томік на ноч у гасцініцу— сам-насам, навобмацак уласным вокам, слыхам, густам: «Калі я чытаю верш Уладзіміра Хадыкі «Пры святле тваіх усмешак», я чую, у ім гучаць нейкія магчымасці абнаўлення маёй мовы новымі паэтычнымі сродкамі». І яшчэ ўбачыў Асееў у Хадыкі (як і ва ўкраінца Паўла Тычыны) «сіняй крэйдай напісаныя маланкі», «пошук слова-адкрыцця» («откровения»)...

Барыс Пастэрнак, выступаючы ў спрэчках, сказаў, што «ўсіх бліжэй» за яго «адхваляваўся Асееў, калі ён гаварыў пра беларускую паэзію... пра радасць, якую прыносіць роднасць моў». І тут жа Пастэрнак аддзякаваў лепшым беларускім паэтам за тое, «што яны такія сапраўдныя».

Самі ж беларускія пісьменнікі дазволілі сабе ў дачыненні да сваёй літаратуры куды большую стрыманасць і самакрытычнасць, хоць думка аб яе бясспрэчных поспехах, аб яе ідэйнай роднасці з іншымі нацыянальнымі літаратурамі Савецкай краіны аднолькава пераканаўча гучэла ў прамовах Я. Коласа і А. Суркова, А. Александровіча і Б. Ясенскага, П. Броўкі і М. Асеева. Прыгадаем, аднак, некаторыя крытычныя галасы.

Якуб Колас: «Беларуская паэзія хварэе на вузкасць свайго паэтычнага далягляду, яна не ўмее шырока і глыбока ахапіць жыццёвыя з'явы, ёй нестае шырыні абагульнення...»

Кузьма Чорны: «Давайце думаць пра літаратуру, як пра мастацтва». (Маецца на ўвазе, што такога разумення не заўсёды хапае беларускім празаікам).

П. Галавач: побач з аптымізмам, які грунтуецца на праўдзе жыцця, ёсць у нас «і аптымізм павярхоўны, крыклівы, з якім трэба змагацца».

Пленум 1936 года і ўсё, што на ім гаварылася (прынамсі, пра беларускую літаратуру), нельга, ды і няможна, «вылушчыць» са свайго часу з усімі яго ўзлётамі і супярэчнасцямі. Не-не, а пачуецца ў словах аднаго з прамоўцаў амаль кананізаваная ў тыя гады «жалезна»-сацыялагічная формула: «Дунін-Марцінкевіч — паэт прыгонніцтва», «Багушэвіч—вястун беларускай буржуазіі», а то і формула, яшчэ злавеснейшая, і як на сённяшняе наша вуха, рэдкая па сваёй несправядлівасці, накшталт: «Паэты-нацыяналісты і контррэвалюцыянеры аб'ядналіся ў арганізацыі «Ўзвышша»...

Аднак формулы—формуламі, а для беларускай літаратуры меў вялікае значэнне сам па сабе факт, што яе надзённыя творчыя праблемы абмяркоўваліся на такім пачэсным форуме, як усесаюзны пісьменніцкі пленум.

Акрамя ўсяго іншага, тут завязваліся знаёмствы, узнікалі кантакты, і не на год, на два—на дзесяцігоддзі.

Пятро Глебка расказвае: «На пленуме ў Мінску я пазнаёміўся з Максімам Рыльскім, і цудоўная абаяльнасць гэтага чалавека, яго талент, культура, гумар літаральна ўзялі мяне ў палон».

Міколу Хведаровічу выпала знаёміць з Мінскам Ілью Сяльвінскага і Мікалая Ціханава,—«і гэта мяне ўзрушыла—паказаць мой родны горад аўтарам «Улялаеўшчыны» і «Балады пра сіні пакет», на якіх мы, беларускія паэты, вучыліся і раслі».

«Тут, у Мінску, пачалася добрая мая дружба з Аляксандрам Пракофевым і Сімонам Чыкавані»,—гаворыць Пятрусь Броўка.

Ды і рускія, украінскія, грузінскія паэты з хваляваннем адкрывалі для сябе новыя імёны беларускіх паэтаў, якіх яшчэ не ведаў усесаюзны чытач.

На адным калектыўным вечары Аркадзь Куляшоў чытаў «З дзённіка брыгадзіра», і калі ён закончыў, то з прэзідыума пачуўся голас Барыса Карнілава: «О, з гэтага хлопчыка вырасце са-а-праўдны паэт!» Такая ўхвала аўтара «Маёй Афрыкі» і «Трыполля», вядома ж, не магла не ўзрадаваць маладога Куляшова...

ДЫК ВОСЬ, НЕАБХОДНАСЦЬ склікання мінскага пленума, думаецца, дыктавалася пільнай патрэбай канкрэтызаваць, «давесці» да ўзроўню кожнай нацыянальнай літаратуры (актыўна ўзнімаючы гэты ўзровень), да пісьменніцкай практыкі ў розных галінах і жанрах той пафас адзінства, тую ўрачыстасць ленінскай літаратурнай палітыкі, што так уздымна натхнёна, ярка сцвердзіў пісьменніцкі з'езд 1934 года.

У цэнтры ўвагі пленума стаяла паэзія.

Аляксей Суркоў прывёў у дакладзе ўрыўкі з горкаўскага пісьма: «Вы гаворыце пра цяжкасці «спалучэння прынцыпаў эстэтычных з момантамі палітычнай мэтазгоднасці». Дарагі Суркоў, цяжкасць гэта не мела б месца, калі б намі адчувалася дзівосная прыгажосць жыцця, што абпальвае душу, палымяны выбух жыццетворчасці ў нашым Саюзе, паскудны трагізм становішча буржуазіі на Захадзе і ва ўсім свеце».

І менавіта на гэтых, акрэсленых Горкім шляхах пранікнення ў эгоху, страснага, партыйнага асэнсавання яе маштабаў якраз і шукалі паэты спалучэння «прынцыпаў эстэтычных з момантамі палітычнай мэтазгоднасці», што і складала на той час першачарговай важнасці і значэння задачу ўсёй савецкай паэзіі...

Яшчэ не забыліся нядобрай памяці рапаўскія часы з іх схаластычнымі догмамі і адміністраваннем, з іх насцярожанасцю да свету пачуццяў і думак самога пісьменніка. Тым большую «вагу», тым большы сэнс набывала абвешчанае на пленуме (хай сабе і не на поўны голас) права паэта-грамадзяніна і сына сваёй краіны шукаць у напрамку, падказаным яго ўласным грамадскім і чалавечым вопытам, яго ўласным веданнем падзей і з'яў.

Бясконцае мноства раз называлася на пленуме імя Маякоўскага, паэта, які не проста адлюстраваў рэвалюцыйную эпоху, а «браў яе на сябе», мераў сваёй меркай «громады любви и громады ненависти».

І зноў жа адбітак часу: жывая постаць жывога Маякоўскага пачала ўжо намаганнямі асобных крытыкаў і паэтаў пакрывацца «хрэстаматыйным глянцам», штучна супрацьстаўляцца **ўсяму** багаццю савецкай паэзіі. Так, перад самым пленумам, на пасяджэнні прэзідыума праўлення ССП, А. Александровіч сказаў: «Група паэтаў—адэптаў Ясеніна творча вымерла, тады як паслядоўнікі Маякоўскага растуць і мацнеюць». (Тое, што Ясенін і Маякоўскі—паэты-антаганісты, у той час лічылася аксіёмай).

Імя Маякоўскага ўсплывала на пленуме кожны раз, калі трэба было даць рашучы бой безыдэйнасці, апалітычнасці, тэндэнцыі абмінуць галоўны змест рэвалюцыйнай рэчаіснасці. (У гэтай сувязі нярэдка называўся і Б. Пастэрнак, і часцей з адмоўным знакам, але з павагай да яго лірычнага таленту і з верай у яго магчымасці да паэта **савецкага**. Сам жа Пастэрнак, адстойваючы свае пазіцыі, сказаў так: «Усё траскуча-ўзнятае і рытарычнае здаецца мне негрунтоўным, бескарысным і маральна-падазроным... Мноства няправільных поглядаў стала догматам таму, што яны сцвярджаюцца заўсёды ў пары з нечым іншым, неабвержным і нават свяшчэнным»).

Імя Маякоўскага называлася і ў якасці найяскравейшага доказу, што мастацтва, народжанае сацыялізмам, мае істотна-новую, наватарскую прыроду і сутнасць.

«Ён стварыў,—сказаў пра Маякоўскага К. Зялінскі,—новы тып сацыяльнага непакою, што абапіраецца не на горды індывідуалізм, а, наадварот, на агромністае пачуццё... сувязі з жыццём усяго прапоўнага чалавецтва, якое пакутуе і змагаецца...»

Асобныя ўдзельнікі пленума паставілі—і з нячастай раней дасведчанасцю і шырынёй—праблему культурных традыцый, праблему **гістарычнасці** нашага паэтычнага мыслення. Відаць, немалаважную ролю ў гэтых адносінах адыграла і тое, што незадоўга перад тым рускі, а значыць, і ўсесаюзны, чытач адкрылі каштоўныя скарбы грузінскай паэзіі, перакладзенай М. Ціханавым і Б. Пастэрнакам.

— Калі выдатны армянскі паэт Я. Чарэнц,—сказаў Павел Антакольскі,— звяртаецца да старых майстроў, будаўнікоў, кладчыкаў ружовага і ліловага горнага туфу, мініяцюрыстаў, да ўсіх, чые біяграфіі згубіліся ў пясках безыменных магіл, ён гэтым устанаўлівае сваю ўласную радаслоўную». (Цяжка пераацаніць, якое значэнне меў **такі** падыход да традыцый для беларускай паэзіі: у нас яшчэ доўга глядзелі на кожную спробу звярнуцца да вытокаў нацыянальнай культуры як на «ідэалізацыю феадальнай мінуўшчыны»)...

Адкрыта, уголас ці, як сёння гавораць, у «падтэксце», многія паэты, што выступалі на пленуме, актыўна і плённа дамагаліся далейшай дэмакратызацыі, калі можна так сказаць, зместу, савецкай паэзіі, дзе ўсё яшчэ вялікае (неапраўдана вялікае) месца займалі матывы інтэлігенцкіх пошукаў, «перабудовы» і г. д. Мяркуем, што творчасць Купалы, Коласа, Ісакоўскага (яго ўсенародная папулярнасць яшчэ была наперадзе), Твардоўскага (праз два месяцы «Красная новь» надрукуе «Краіну Муравію») «штурхалі» савецкую паэзію ў тым напрамку, які меў на ўвазе, напрыклад, Міхаіл Галодны, калі ён крытыкаваў яе недахопы: «...масавая асоба... яе пачуцці, яе думкі, яе справы, яе любоў і нянавісць, жыццё і смерць, яе дзяржаўнасць, яе мары пра будучыню пакуль яшчэ не сталі душой сучаснай паэзіі». Пра **тое ж** гаварыў у дакладзе і А. Суркоў.

Новыя далягляды. Новы герой. І новае па сутнасці, спелае разуменне майстэрства, што з ходу, бескампрамісна і рэзка адкідвае ўсякую «самацэннасць» тэхнічна-фармальнага моманту, беручы кірунак на форму змястоўную, натуральную, здатную перадаць жывую рэальнасць у яе «нармальных» прапорцыях, фарбах, аб'ёмах.

Максім Рыльскі гаварыў пра «арганічную форму верша». Сімон Чыкавані—пра мастацкую прастату: «Яна падобна на чалавека, што падняўся на высокую вяршыню і, пераадолеўшы вялікія цяжкасці... можа свабодна ўздыхнуць». Аляксей Суркоў—пра «натуральную адпаведнасць сродкаў адлюстравання новаму зместу» і пра тое, што «адрыў ад чытача не меш небяспечны, чым падладжванне пад адсталы чытацкі густ»... І, нарэшце, словы Мікалая Брауна, які сцісла і тэмпераментна выявіў тое, што можна назваць духам пленума, ва ўсякім разе, усяго лепшага і творча перспектыўнага ў яго паэтычнай дыскусіі:

— Мы перабудоўваем наш верш, усе сродкі яго. Мы ўваходзім у самую гушчыню народнай творчасці. Мы адмаўляемся ад прыўзнятага, перанапружанага голасу. Мы шукаем голасу жывога, натуральнага. Мы бяром тэмы рознай важкасці і не стараемся штучна прыпісваць ім значэнне, якога яны не маюць. Мы шукаем правільнага і праўдзівага раскрыцця, якім геніяльна валодаў Пушкін»...

ВАКЗАЛ. ЦЯГНІК. СЦЯГІ. Мінск развітваецца з дарагімі гасцямі, удзельнікамі пленума, пісьменнікамі, паэтамі многіх савецкіх народаў... Што там, за бліжэйшым перагонам часу? Праца, кнігі, шырокія чытацкія аўдыторыі, няспынны рост савецкай паэзіі. І цяжкія, трагічныя выпрабаванні. І вайна... «Таварыш, мы будзем разам...»

У гісторыі савецкай літаратуры, у летапісу нашых шуканняў, спрэчак, страт і здзяйсненняў, бясспрэчна, знойдзе месца і пісьменніцкі пленум трыццаць шостага года.

Мінскі, паэтычны...

Р. БЯРОЗКІН.

З ТРЫБУНЫ ЗАКЛЮЧНАГА ВЕЧАРА ГУЧАЛА НАТХНЕНАЕ СЛОВА...

Мікалай АСЕЕЎ:

Что такое счастье, милый друг?
Что такое счастье
Близких двух?..
Едет счастье, едет, едет,
Еле слышен шины хруст,
Медленно на велосипеде
Катит драгоценный груз.

Андрэй АЛЕКСАНДРОВІЧ:

Скрышаючы косці развалін старызны,
Грыміць перамогамі слаўны салют.
Агнямі ўрачыстасці сацыялізма
Заліт рэвалюцыі нашай маршрут.

Іосіф УТКІН:

... И он погиб, судьбу приемля,
Как подобает молодым:
Лицом вперед,
Обняв землю,
Которой мы не отдадим!

ФОТАГРАФІЯ НАГАДАЛА... У ТЫМ ПАМЯТНЫМ СНЕЖНІ

Групавое фота. У цэнтры — славуты савецкі лётчык Валерый Паўлавіч Чкалаў. Прама за ім — малады чалавек, у якім нецяжка пазнаць Пімена Панчанку.

Мы пап, асілі П. Панчанку расказаць пра гэта фота.

— На пачатку снежня 1938 года ў Маскве сабраліся курсы (ці як іх назвалі, курсы-канферэнцыя) маладых пісьменнікаў адзінаццаці саюзных рэспублік. З Беларусі, акрамя мяне, на курсы паехаў крытык Р. Бярозкін.

Гляджу на здымак і пазнаю многіх пісьменнікаў, якія сёння актыўна працуюць у савецкай літаратуры: кіргізскі пісьменнік Т. Сыдыкбекаў, таджыкскі — Ф. Ніязі, азербайджанцы А. Касумаў і Г. Зейналава, украінцы В. Ткачэнка і П. Байдзбура. Няма на здымку Мірзо Турсун-задэ і Аванеса Шыраза — яны таксама былі на курсах.

Той снежань, праведзены ў Маскве, — адно з самых радасных, незабыўных уражанняў майго жыцця. Не кажучы пра тое, што гэта быў мой першы прыезд у Маскву, першае маё знаёмства з ёю, — сама інтэнсіўнасць гэтага снежня, незвычайная паўната і разнабаковасць яго «праграмы» не маглі не пакінуць найглыбейшага следу ў сэрцы.

Падумаць толькі... Мы сустракаліся і гутарылі з А. Талстым і А. Фадзеевым, Ус. Меерхольдам і І. Бабелем, М. Асеевым і П. Паўленкам, К. Федзіным і М. Тарханавым, А. Таіравым і Ус. Вішнеўскім, М. Кедравым і С. Абразцовым, В. Катаевым і В. Інбер... Мы прагледзелі звыш дваццаці спектакляў: толькі ў адным Мастацкім — «Анну Карэніну», «Гарачае сэрца» і «Ворагаў». Мы пабывалі ў майстэрнях буйнейшых мастакоў, у лепшых маскоўскіх музеях.

14 снежня з намі сустрэўся чалавек цудоўнай шырыні і прывабнасці — Валерый Чкалаў, і фотаздымак, што ў маіх руках, — памяць аб гэтай сустрэчы. (Дарэчы, у мяне ёсць верш 1940 года, прысвечаны Чкалаву, так і названы — «Фотаздымак»). Я дакладна помню, што сустрэча з вялікім лётчыкам адбылася 14 снежня, бо назаўтра раніцою, прыйшоўшы ў Дом пісьменніка, мы пачулі жахлівую навіну аб трагічнай гібелі Валерыя Паўлавіча.

Ул. БАСАЛЫГА. Пано. «Бондар Васіль», «Бондар Алесь», «Ганчар Якуб», «Радасць» (дрэва, інкрустацыя).

СЯРОД КНІГ

ЖЫЦЬ НА ЗЯМЛІ

Сузор'і і галактыкі, ракеты і арбіты, аэрадромы і стартавыя пляцоўкі, радары і электронна-вылічальныя машыны, зорныя дарогі, робаты, рэактары, лазеры... Адзнакі нашага касмічнага і атамнага веку, яны запаланілі нашу паэзію, стаўшы ў ёй і адзнакамі сучаснасці, прагрэсу, пранікнення навукі і тэхнікі ў свядомасць і побыт людзей. Але, на жаль, надзвычай часта даводзіцца чытаць вершы, у якіх за гэтымі словамі не знаходзім мы глыбокай і значнай сучаснай думкі, не відно, якое месца гэтыя рэаліі веку займаюць ва ўнутраным жыцці самога аўтара. У такіх выпадках гэта стракаценне «сучасных» слоў выклікае пратэст...

Мне здаецца, кніга вершаў К. Цвіркі «Чарназём» якраз і з'яўляецца палемічнай рэакцыяй паэта на такую знешне сучасную паэзію, бо гэта кніга кліча да першавытокаў чалавечай духоўнасці. А гэтыя першавытокі К. Цвірка бачыць у самых зямных і рэальных будзённых справах вясковых працаўнікоў, у тых першародных рэчах, якія заўсёды былі ў аснове чалавечага жыцця.

Апяваючы рэальную чалавечую справу, сцвярджаючы яе духоўную значнасць, К. Цвірка ваюе ў сваёй кнізе і з той «прывіднай», кніжнай рамантыкай, якая адарвана ад зямнога жыцця чалавека-працаўніка. Хопіць блукаць у нябёсах, годзе шукаць натхнення толькі ў блакітных высях. Пара вяртацца на зямлю, дзе жывуць, працуюць, радуюцца, а часам і засмучаюцца людзі. Мусіць, тут паэта чакаюць сапраўдныя адкрыцці, тут яго думкі і пачуцці знойдуць сабе апору, тут яго слова набудзе патрэбныя фарбы і гукі. Здаецца, гэта хоча сказаць нам К. Цвірка ў вершах сваёй новай, трэцяй па ліку, кніжкі.

І я паблукаў па нябёсах,
Даволі!
Што вырасці можа
На воблака прывідным полі?
Каб быць умалоту,
Патрэбнаму кожнаму дому,
Хутчэй спускацца з аблок
Да жыцця чарназёму!

Гэта — у самай агульнай форме крэда паэта. Праўда, можа і не варта цурацца «блукання па нябёсах»—хіба толькі «ўмалот» патрэбен «кожнаму дому»? Але галоўнае тут — сцвярджэнне сваёй адданасці зямлі, «чарназёму», выяўленне любві да хлебароба, да чалавека, які працуе на зямлі.

І не выпадкова, пэўна, адкрываецца кніга вершам «Чорная скіба»:

З-пад плуга твайго — убачыш
здалёк—
Па полю наўпрост, за сялібай,
Плыве і пакорна кладзецца
на бок
Чорная скіба.

Чорная скіба! Пара—дымком.
Як хлеб, які на жары быў,
Ляжыць пад воблакам-
ручніком
Чорная скіба...

Я перапыняю тут цытату, бо гэтыя радкі здаюцца мне лепшымі ў вершы. Есць у іх і добрае слова пра зямлю-карміцельку, «чорную скібу», пра галоўны здабытак чалавечай працы — хлеб, і прытым здабытак не толькі матэрыяльны, але і маральны (сумленная праца на зямлі — найпершы ідэал паэта), і эстэтычны (хораша ўдаўся паэту гэты пераход, перамена значэнняў, калі «чорная скіба» ўяўляецца боханам хлеба «пад воблакам-ручніком»).

Усё, што гаворыцца ў вершы далей, не выклікае пярэчання—і тое, што чорную скібу «яшчэ нават продак продка твайго варочаў яе і раскідваў», што мноства паэтаў, будаўнікоў, вучоных «карміла спакон вякоў чорная скіба», што

Аснова асноў, без яе чалавек
Да зорак дайшоў бы хіба?
Таму і спяваю я песню табе,
Чорная скіба!

Але ўсё гэта здаецца не больш чым публіцыстычным каментарыем, які агаляе змест верша, зводзячы яго да бясспрэчнага тэзіса.

Ды ўсё ж паэту, мабыць, асабліва дарагая менавіта гэтая, тэзісная, частка — ён часта і настойліва дэкларуе і варыруе, у залежнасці ад настрою і повару, амаль тую ж самую думку, што часам (на жаль, здаецца, частавата) не ўваходзіць арганічна ў змест верша і выглядае знарочыстасцю, позай.

Вось чытаем:

Калі над горадам
усходжваецца непагода,
зрываючы з паважных
дзядзькоў капелюшы—
Гэй, пераймі там, сябар! —
калі яна між дамоў шалее,
дзеркачом завірухі змятаючы
людзей з тратуараў
за дэрмацін дзвярэй,
дзе аж трашчаць ад нагрэву
трубы цеплацэнтралі,
я думаю пра вас, землякі
зялёнадуброўцы
(вы на чорнай—зімою
белай—зямлі,
якая адкрыта перад усімі
зорамі і вятрамі,
як жылі, жывяцё,
безабаронна й нязрушна,
як дрэвы).

Няўжо не адчувае паэт прымусовасці і штучнасці такога кірунку для супастаўлення горада і вёскі ці, дакладней, гараджан і вяскоўцаў? Хіба так ужо трэба для таго, каб уславіць селяніна-працаўніка (а паэт пераходзіць да яго ўслаўлення, адштурхоўваючыся ад гэтага пачатку), рабіць гараджан абывацелямі, гэтакімі «паважнымі дзядзькамі ў капелюшах», выкарыстоўваючы і нягнятаючы застарэлыя і даволі ўмоўныя атрыбуты мяшчанства, ад якіх ужо сёння адмовілася нават калісьці ахвочая на іх сатырычная паэзія?

Можа быць, менавіта гэтая прыдуманасць, што заўважаецца напачатку верша, перашкодзіла паэту сказаць змястоўнае і важкае слова пра сваіх землякоў, пра якіх, уласна, напісаны верш. «Бачу Вас, Ясь Дубовік. Вы скора справіце сваё 80-годдзе, а ідзяце яшчэ з вёламі на Канаву — вяршыць стагі свайго чарговага лета... Бачу Вас, стары Галляш — самы першы ў вёсцы грыбнік, казачнік і сейбіт... Бачу Вас, Антон Цвірка — вялікі пчаляр... Вас, Бэрнусь Паўловіч— скрыпач-чараўнік...» Як відаць, акрамя характэрных імён і прозвішчаў, землякі паэта (ці яго так званага лірычнага героя) нічым асаблівым не вылучаюцца.

І зноў жа, тут, як і ў вершы «Чорная скіба» (памятаеце: «Таму і спяваю я песню табе...»?), паэта цягне да дэкларацыйнага апявання: «І пра кожнага з вас, калі ў мяне толькі хопіць сілы і таленту, я напішу яшчэ — абавязкова! — па самай светлай паэме!»

Пры такім падыходзе «да жыцця чарназёму» захапленне паэта працай селяніна, хлебароба набывае часам ненатуральнае гучанне, выяўляючыся ў нейкай незвычайнай, сусальнай узнёсласці:

О, як гэта проста —
за плугам ісці баразною,
О, як гэта мудра —
за плугам ісці баразною.

Гэта — з верша «Чатыры вятры», у якім нямала вось такой шматзначнасці. Аўтар бясконца паўтарае, напрыклад, ідучы ад увогуле добрага, але даўно ўжо не новага вобраза: «з раніцы людзі гуртом убіраюць сонца: сыплецца ў бункер жыта струменем — сонца, падае яблык... — сонца, на градах лісцё качаны раскрылі — сонца, вазы агуркоў, памідораў скрыні — сонца. Сонца, сонца, сонца...» І далей яшчэ — сонца, сонца, сонца...

Калі ж паэт адыходзіць ад нейкай тэзіснай устаноўкі, ад гэтага—«напішу абавязкова»,—аказваецца ён умее гаварыць шчыра, проста, задушэўна, і яму ёсць што расказаць. У гэтым жа вершы ёсць радкі, якія, мабыць, усхвалююць не аднаго мяне:

Заўчора да дня
над Анцінымі вязамі
гусі праляцелі —
туды, на Зазер'е.
А сёння сыплецца —
на дровы, на пералазы—
снег —
белае пер'е.
Маці адставіла ўбок даёнку,
глядзіць за шыбы нямыя:
снег
накрывае
марляю тонкаю
гароду
груды грубыя.
Зіма...
Няўжо гэта праўда,
што ўжо яна
на дварышчы?
Во рукі ж гараць яшчэ —
не даць ім рады—
ад асакі ды іржышча.

Ёсць тут жывое, а не прыдуманае пачуццё. Мне, напрыклад, прачытаўшы гэтыя радкі, захацелася ступіць на парог роднай хаты, стрэпіць матулю і, як у дзяцінстве, прытуліцца шчакой да яе цёплай і ласкавай далоні... Можа і досыць от гэтага ад верша?..

Вось такой празрыстасцю, ненадуманасцю, праўдай пачуццяў, пазбаўленых знарочыстасці, прывабілі мяне вершы «Перлы роднай зямлі» — аб «звонкім слове матчыным», якое, «як скарб дарагі, перададзены ў спадчыну, у сэрцы хавае народ»; «Ёсць на свеце краіна...»—пра плынь жыцця, пра своеасаблівае хараство «трох краін на свеце», «краіны Учора, краіны Сёння, краіны Заўтра»; а яшчэ — вершы «Цецерукова мова», «Пра сабак, якія вартуюць дачы», «На той зямлі...», «Люблю па базары...» (апошні верш, праўда, крыху расцягнуты).

...Ёсць у кнізе «Чарназём» верш «Я праўду шукаў...» Паэт (ці лірычны герой?) шукаў праўду «ў кнігах трох знаных вучоных». А потым «шпурнуў тыя «кнігі» ў смецепровад і, узяўшы білет, паехаў да сваёй маці». Там, у вёсцы, ён разам з мужчынамі касіў «сівец і малачай, белы авёс з васількамі», скідваў стагі, малаціў, «гной сахаром раздзіраў», спяваў песні і... знайшоў праўду, «нічым не схаваную, на заслоненую». Верш гэты, як відаць, трымаецца, зноў-такі, усё на тым жа супрацьпастаўленні: «нябёсы, аблокі» — «чарназём жыцця», прытым у гэтым вершы такое супрацьпастаўленне выглядае яшчэ больш штучным і, зрэшты, наіўным.

А мусіць, не трэба супрацьпастаўляць адно другому — гэта не плённа, не трэба «блукаць па нябёсах» і загадваць сабе вярнуцца на зямлю, а проста жыць на ёй, жыць адным жыццём з сучаснікамі.

М. ГІЛЬ.

К. Цвірка. «Чарназём». Вершы. Выдавецтва «Беларусь». Мінск. 1967.

ПРАЗ ДЗЕСЯЦІГОДДЗІ

Сцісла і папулярна расказаць пра шляхі беларускай літаратуры за пяцьдзесят гадоў Савецкай улады, вызначыць яе асноўныя кірункі і этапы— вось мэта, якую ставіў сабе Міхась Лынькоў у кніжцы «Летапіс эпохі».

Напачатку аўтар коратка прыгадвае перадкастрычніцкі перыяд грамадскага і літаратурнага жыцця ў Беларусі, калі родная мова была у загоне, калі друкаванае беларускае слова забаранялася. М. Лынькоў характарызуе творчасць волатаў беларускай літаратуры Янкі Купалы і Якуба Коласа, якія яшчэ ў змрочны час царызму паднялі гнеўны голас у абарону роднага народа, абуджалі яго свядомасць, клікалі на барацьбу з прыгнятальнікамі. У Кастрычніцкай рэвалюцыі народныя паэты ўбачылі здзяйсненне сваіх запаветных мар. Я. Купала і Я. Колас разам са сваімі паплечнікамі сталі натхнёнымі песнярамі Кастрычніка.

Затым М. Лынькоў дае агульную характарыстыку літаратуры першага паслякастрычніцкага дзесяцігоддзя.

У 30-я гады беларуская літаратура ўступіла значна пасталеўшай. Яна набыла пэўны вопыт, стала глыбей пранікаць у жыццё.

Далей М. Лынькоў разглядае беларускую літаратуру перыяду Вялікай Айчыннай вайны. 40-х і 50-х гадоў прасочвае тыя працэсы, што адбываліся ў ёй.

Падводзячы вынікі гаворкі пра беларускую літаратуру за пяцьдзесят савецкіх гадоў, аўтар падкрэслівае, што ў апошні час яна дасягнула сваёй ідэйнай і мастацкай спеласці.

Ёсць у кніжцы пэўныя прагалы, простае пералічэнне імён і твораў, эскізнасць (асабліва ў апошніх раздзелах). Сустракаецца і залішняе, мабыць, захапленне аднымі творамі і недастатковая ўвага да іншых. Варта было б, мне здаецца, шырэй сказаць пра беларускую драматургію, крытыку, а таксама пра гумар і сатыру. Тым не менш крытычны нарыс народнага пісьменніка «Летапіс эпохі» дае цэласнае ўяўленне аб слаўным шляху беларускай савецкай літаратуры.

Г. ЮРЧАНКА.

М. Лынькоў. «Летапіс эпохі». Выдавецтва «Навука і тэхніка». Мінск. 1968.

Уладзімір КОРБАН

НАВУКА

ФЕЛЬЕТОН

Мне вершы прыслаў
Пачынаючы нехта.
Зірнуў я ў паперы
І выдыхнуў: «Эх, ты!
Магчыма й радкі
Зрыфмаваў ты не блага,
Ды дзе ж твая, хлопча,
Да вершаў павага,
Да ўласнага сэрца,
Да мары пякучай!..»
Папера старой
Выглядае анучай,
Нібыта ёй выцерлі
Недзе халявы.
Напісана брудна,
Нядбайна, карава.
Чарнільныя кляксы,
Ды плямы ад сала.
І дужа балюча
І крыўдна мне стала
За вершы таго
Маладога паэта.
Тады я і ўспомніў
Здарэнне вось гэта.

□

Год сорак назад,
Мапады, зухаваты,
Прыйшоў на завод я
І стаў да варштата.
Стараўся заўсёды,
Не дрэнна вучыўся
І токарам добрым
Нарэшце зрабіўся.
Якраз ухапіла
За сэрца каханне...
Аднойчы я дужа
Спяшыў на спатканне.
На поршні канаўкі
Разцом выбіраю,
А сам на гадзіннік
Усё пазіраю.
Нарэшце — гудок.
За пінжак і дадому.
Спатканне тады
Адбылося, вядома,
Ды толькі аб ім
Я расказваць не буду.
Спатканне было,
Як заўжды, як усюды.
Такія спатканні
Спрадвеку бываюць,
Калі незгасальна
Два сэрцы палаюць,
Таму я на ім
І не буду спыняцца...
Назаўтра прыходжу
У цэх я на працу,
Пінжак распранаю,
Станок запускаю,
І поршань абточваць
Ізноў пачынаю,
Ганяючы супарт
Па гладкай станіне.
І тут нечым дужа
Пякучым па спіне
Мне нехта як смальне,
Што я ажно ўгнуўся
І як ашалелы
На месцы крутнуўся.
А ззаду наш майстар
З раменнаю дзягай...
«Ты што ж гэта, — кажа, —
Блазнота, бадзяга,
Так ставішся дрэнна
Да брата-варштата!
Пабег, не пачысціў,
Падаўся дахаты!
Запомні, паганец, —
І стукнуў у грудзі, —
З нядбайніка майстра
Ніколі не будзе.
Майстэрству патрэбна
Любоў і павага!»
І зноў узнялася
Няўмольная дзяга,
Ды ўспеў я адскочыць...

□

Гады прашумелі.
І скроні мае ўжо
Даўно пасівелі,
Не мала было ў мяне
Стуку і груку.
І дзякаваў майстру
Заўжды за навуку.
Вядома, не дзяга
Тут ролю сыграла,
А добрае слова
У сэрца запала.
Па гэтаму, пэўна,
Да сёння, прызнацца,
Цярпець не магу я
Нядбайнае працы.

□

Здаецца, не грэх бы
«інструкцыю» гэту
Запомніць на век
Маладому паэту.

З пошты ЛіМа

КОТ У МЯШКУ

Я жыву ў даволі вялікай вёсцы, цэнтры саўгаса. Ёсць сярэдняя школа, бальніца, аптэка, сельскі Савет, паштовае аддзяленне. У клубе амаль кожны вечар ідзе кіно — на гэта крыўдаваць не даводзіцца. Дзіўна толькі тое, што наведваюць сеансы звычайна не больш пятнаццаці—дваццаці чалавек. І ўсё, мне здаецца, таму, што ніхто на сяле кінафільмаў як след не рэкламуе.

Як і пяць, як і дзесяць гадоў назад, каля клуба ці на электрычным слупе прыбіваецца афіша, на якой надрукавана слова «Кіно» і ад рукі дапісваецца назва карціны, час дэманстрацыі фільма і цана білетаў. Але ж гэта, прызнайце, нічога не дае ні розуму, ні сэрцу. Гэта — як купляць ката ў мяшку. Ніхто не возьме ў бібліятэцы кнігу, пакуль не перагорне яе, не даведаецца, аб чым новым яна раскажа табе, чым узбагаціць. А вось аб кінафільме мы чамусьці павінны дагадвацца толькі па назве.

Нядаўна ў нас на афішы было напісана «Акно ў неба». Сабраліся ў клубе гледачы, гадаюць — пра што фільм? Кінамеханік гаворыць — пра ракетчыкаў. Хтосьці ўпэўнена заявіў, што не, пра класавую барацьбу ў літоўскай вёсцы. Прыхільнік гэтай думкі меў, аказваецца, на ўвазе фільмы «Ключы да неба» і «Лесвіца ў неба», а гэта была зусім іншая карціна. Многія ж не пайшлі, думалі, што ўжо бачылі.

Нядаўна на кінаафішы было напісана: «Я вас кахаў». Некалькімі днямі раней я чытаў станоўчую рэцэнзію на гэты фільм, ведаў, пра што ён расказвае, і параіў паглядзець яго старшакласнікам. Зала была поўная...

— Вось, каб заўсёды хто праводзіў агітацыю, — жартаваў механік, даючы білеты...

Іншы раз траплялі ў нашу вёску і рэкламныя лісты, надрукаваныя ў друкарні («Балада аб салдаце», «Ціхі Дон», «Лёс чалавека»). Але было гэта надзвычай рэдка.

Дык як зрабіць, каб і ў вёсцы стала лепшай рэклама? Над гэтым варта задумацца работнікам Дзяржаўнага камітэта па кінематаграфіі пры Савеце Міністраў БССР. Мне здаецца, што не вельмі вялікіх сродкаў патрабуе выпуск лістовак пра той ці іншы фільм, але яны б адыгралі сваю ролю. Можна прыдумаць шмат чаго і іншага.

Кіно — не раскоша. Яго роля ў выхаванні людзей, — асабліва падрастаючага пакалення, расце з кожным днём. І таму нам, настаўнікам, не абыякава, як прапагандуецца гэтае важнейшае з мастацтваў.

в. Каменка, Шчучынскага раёна.

І. ПЯШКО,
настаўнік.

ЦІ МОЖНА ТАК?

Мне давялося паглядзець спектакль «Вайна пад стрэхамі» па раману А. Адамовіча ў Беларускім дзяржаўным тэатры імя Я. Коласа. Гэта было ў нядзелю, і я, мабыць, захаваў бы самыя добрыя ўражанні ад гэтай сустрэчы з даўно любімым тэатрам і сапраўды цудоўным творам сцэнічнага мастацтва, які на працягу трох гадзін трымае глядзельную залу ў вялікім эмацыянальным напружанні, калі б... не чацвёртая гадзіна.

Грамадская мэтанакіраванасць пастаноўкі і надзвычай глыбокая артыстычная распрацоўка кожнага сцэнічнага персанажа. Абыякавых у зале не было, не магло быць — такі твор, такая праўда мастацтва. Але вечар усё ж быў сапсаваны. І не толькі ў мяне аднаго. Не ведаю, магчыма, для таго, каб прыцягнуць увагу да тэатра ў нядзельны вечар кіраўніцтва абвясціла пасля прадстаўлення — танцы. Увогуле, відаць, такая практыка невыпадковая, хоць у той вечар танцавалі зусім не ўсе, хто прыйшоў у тэатр. Мяне абурыла тое, што ў Віцебску наладжваюць танцы пасля такіх спектакляў, як «Вайна пад стрэхамі». Драматызм барацьбы, ахвяры вайны, душэўны пералом у юных героях... «А пра тых, хто загінуў і не вернецца ніколі, — заклінаю вас — помніце!» — такімі словамі закончыўся спектакль. Мінута напружанай цішыні — і ўзарвалася воплескамі зала.

І тут з фае пачуліся гукі — лёгкая джазавая мелодыя.

Некаму не хапіла такту, некаму здрадзіла пачуццё меры— і вось вам чацвёртая гадзіна: танцы. Кашчунства не мае межаў, так яно было і ў той вечар.

Я пішу гэта, каб у тэатры імя Я. Коласа ведалі, што такія выпадкі не красяць паважаны артыстычны калектыў. Веру, што нешта зменіцца пасля таго, як будзе выказана абурэнне хоць бы і аднаго гледача.

М. МАЙЗЛЕР,
заслужаны артыст БССР.

У раённым цэнтры Дзятлава ў юбілейным годзе адкрыецца музей народнай славы. Яго экспанаты, размешчаныя ў дзевяці залах, расскажуць аб рэвалюцыйных, баявых і працоўных традыцыях Гродзеншчыны. На здымку — дырэктар музея М. Петрыкевіч (у цэнтры), мастакі Г. Саўчыц і С. Сілуянаў рыхтуюць экспазіцыю.

Фота А. ПЕРАХОДА. (БЕЛТА).

Іван МЕНШЫКАЎ.

ДЗЯЎЧЫНА З РАКІ СЮРЭМБОЙ-ЯГА

АПАВЯДАННЕ

У гарадскім пасёлку Лельчыцы ў маладым парку ўзвышаецца помнік-абеліск. На мармуровай дошцы сярод імён воінаў і партызанаў, што загінулі за свабоду Радзімы, ёсць і імя ваеннага карэспандэнта «Комсомольской правды» пісьменніка Івана Меншыкава.

Іван Меншыкаў нарадзіўся ў 1914 годзе ў сяле Айліне Чэлябінскай вобласці. Скончыў сямігодку, авіяцыйны тэхнікум і літаратурны інстытут імя М. Горкага.

Вясной 1943 года Іван Меншыкаў атрымлівае накіраванне ў беларускі партызанскі край. Ён запісвае ў дзённіку: «Настрой цудоўны. Сёння заўтра еду ў нямецкі тыл, поўнасцю абмундзіраваны і ўзброены. 19 красавіка быў прыняты ў кандыдаты партыі і гэта нейк змяніла ў ва мне штосьці. Нібы прайшло маё дзяцінства, юнацтва і наступіла мужнасць. Як многа трэба і можна зрабіць...» Гэта быў апошні запіс у дзённіку пісьменніка. 28 красавіка 1943 года самалёт, на якім ляцеў Іван Меншыкаў, разбіўся на партызанскім аэрадроме каля вёскі Дубніцкае паблізу Лельчыц.

Прапануем чытачам у перакладзе на беларускую мову апавяданне Івана Меншыкава «Дзяўчына з ракі Сюрэмбой-Яга», якое напісаў ён, працуючы на Поўначы, у Нянецкай нацыянальнай акрузе, куды прыехаў па камсамольскай пуцёўцы.

Калі ад цёплых лясоў, далёкіх лясоў падымаюцца лёгкія ветрыкі, каб несці на сваіх шырокіх плячах даўгакрылых лебедзяў, рака Сюрэмбой-Яга ўжо скідае ў акіян сваю ледзяную маліцу.

З тысяч азёр бягуць да яе ручайкі, і гусіны пух, і лебядзінае пер'е плыве па вадзе, кружачыся, як пена.

На паўдарозе Сюрэмбой-Яга запавольвае бег, і алені з вялікага стойбішча прыходзяць да яе на водапой. Яшчэ не ўсе скінулі рогі, белыя, пазелянелыя, адлюстроўваюцца ў спакойнай вадзе.

А крыху ніжэй стойбішча стаяць высокія гранітныя скалы. І Сюрэмбой-Яга ніяк не хоча прымірыцца з гэтым. Яна бурчыць, злуецца, становіцца на дыбы каля перакату і, знясіленая, падае па другі бок яго.

Вось на гэтым перакаце і суджана мне было пазнаёміцца з Тоняй Вылко.

Я ехаў у стойбішча збіраць казкі і песні.

Рака Сюрэмбой-Яга перагарадзіла мне дарогу.

Я спыніў запрэжку і ўбачыў на другім беразе дзяўчыну. Я ветліва памахаў ёй рукой і закрычаў, пытаючыся, як праехаць у стойбішча.

Грукат вадапада заглушыў яе адказ, але я ўбачыў, што яна паказвае рукой улева.

Алені нехаця ўвайшлі ў раку. Палазы нартаў, дробна слізгаючы, паўзлі па дне ракі. Вада ўжо заліла бакі аленям, калі я ўбачыў калгаснікаў, якія беглі да ракі. Яны беглі і махалі рукамі. Я адчуў, як пачынае стукаць кроў у скронях. Вада ўжо была мне па калені, і галіністыя рогі аленяў плылі над ёю. Гусіны пух круціўся вакол іх, і алені фыркалі, напружваючы апошнія сілы, каб не патануць...

Каб не было сонца, я пакінуў бы, напэўна, запрэжку і паспрабаваў бы даплысці да берагу адзін. Але свяціла сонца, вясёлае, чэрвенскае сонца, і цяжка было паверыць, што мы патонем.

Я глядзеў на бераг і нешта крычаў. Цячэнне рэзка павярнула запрэжку і панесла на каменні, да вадапада.

І тут на момант я зноў убачыў дзяўчыну. Яна выхапіла тынзей з рук пастуха і пабегла да вадапада. Яна стала на высокім камені, зрэзаным вадой, і побач з ёю сталі пастухі.

Шум вадапада аглушыў мяне. Я забыўся пра ўсё на свеце, акрамя яго грукату.

Але ляснуў тынзей у руках дзяўчыны. Ён развярнуўся і туга захліснуў мяне папярок тулава. У гэты міг я ўбачыў сонца, белыя баранчыкі над каменнямі, пух, які кружыўся на рацэ.

...Ачнуўся я ўжо на беразе. Вакол мяне сядзелі пастухі і спакойна курылі. Дзяўчына перавязвала мне галаву марляй.

Пастухі ўсміхнуліся мне і загаварылі дабрадушна па-нянецку.

— Вучоны чалавек, напэўна, а дурны,—казалі яны.

— Нічога вы не разумееце,— адказала дзяўчына,—ён смелы, таму і паехаў праз раку.

— А хто яго ведае, магчыма, ён і сапраўды смелы,— ахвотна згадзіліся яны.—Запытайся на яго мове, хто ён такі.

Дзяўчына скончыла перавязку і села побач са мною. Яна паглядзела на раку і запытала:

— Ты адкуль, таварыс?

Як многія ненцы, яна не вымаўляла «ш», і ад гэтага мова яе была падобна на дзіцячую.

— З Масквы,— адказаў я і ўспомніў пра свае сшыткі.

Але сшыткі былі ўжо акуратна раскладзены на беразе і прыціснуты каменнямі.

— З Масквы?— здзіўлена перапыталі пастухі.—Бач ты! З Масквы...,—пачціва паглядзелі яны на мяне.

— А хто ты такі, таварыс?—зноў спытала дзяўчына і збянтэжана апусціла вочы: дзяўчыне не дазвалялася пытацца першай у невядомага мужчыны.

— Пісьменнік,—сказаў я, стараючыся, не бянтэжыць дзяўчыну.

— Пі-і-сар? — здзівіліся пастухі. — Запытайся яшчэ, а ці вялікі пісар?

Я паспрабаваў ім растлумачыць гэтае слова, і яны зусім задаволена заківалі галовамі.

— Вялікі, аднак пісар, накшталт валаснога,— сказалі яны, з цікаўнасцю разглядаючы мяне.

— А я камсорг, таварыс,—сказала дзяўчына,— зваць мяне Тоня Вылко.

І сарамліва дадала:

— Мяне сёння крытыкаваць будуць. Прыходзь: ты ж камсамолец, напэўна. Ты ж з Масквы.

— Камсамолец,— сказаў я.

Тоня ўздыхнула. Яна сумна глядзела на раку, а калі пастухі разышліся са стойбішча, пакінуўшы нас адных, яна спытала:

— Скажы, таварыс, ці можна камсоргу пасагам займацца?

— Чаму ж нельга?

— Бачыш, я хлопца аднаго пакахала,—Тоня збянтэжылася, цёмна-смуглыя шчокі яе крануў лёгкі румянец.—Я цяпер шыю пасаг, замуж выйсці хачу, а хлопцы мяне збіраюцца крытыкаваць. Што б галоўны сакратар абкома камсамола на маім месцы зрабіў?

— Сакратар жа хлапец,—сказаў я,—і ён жанаты, а ты шый сабе, а на сходзе я пагавару...

— Шкада, што ён жанаты,—сказала дзяўчына,—а то я б ім падказала факт, і яны б сціхлі. Праўда?

— Праўда,—сказаў я сур'ёзна.

Мы з паўгадзіны сядзелі на беразе і моўчкі глядзелі на Сюрэмбой-Яга.

— Аленяў тваіх мы тынзеем вылавілі. А мужчыны з мяне смяюцца—жаніха, кажуць, злавіла... цябе, значыць...

Дзяўчына мякка ўсміхнулася і ўстала.

— Паспі, стаміўся з дарогі. А потым на крытыку прыходзь.

Так я пачаў жыць у стойбішчы пры рацэ Сюрэмбой-Яга. Вечарамі ля вясёлага кастра я запісваў казкі і быліны, чытаў пастухам акруговую газету «Чырвоны тундравік», ездзіў вартаваць аленяў.

І Тоня Вылко, камсорг калгаса «Вяршыня чатырох рэк», была мною задаволена.

— Ты актыўны, таварыс,—казала яна,—давай я цябе на ўлік у сваю арганізацыю пастаўлю. А? Ты камсоргам будзеш, а я ручыцца ў Архангельск паеду. Ты вунь які вучоны! Пішаш і на паперу не глядзіш, як алень капытамі бяжыць і не глядзіць на іх. Мы нявесту табе знойдзем,—хітра казала яна.—У нас багатыя дзяўчаты ёсць.

Раніцай Тоня будзіла мяне:

— Прачынайся, пісар, сонца ўжо ўзышло.

Наспех выпіўшы чаю, я выходзіў з чума і садзіўся на нарты. Седзячы на нартах, я назіраў за Тоняй Вылко і дзівіўся яе нястомнасці. Яна многа працавала і заўсёды спявала песні. Смешныя, сумныя, вясёлыя песні.

Нацягнуўшы на дошку шкуру аленя, вільготную ад густой і кіслай мукі, у якой яна ляжала, дзяўчына брала жалезны скрабок і здзірала ім са шкуры мяздру, дапамагаючы рабоце песенькай:

Над чумам стаіць вялікая зорка,
Да мора бяжыць вялікая вада.
На хуткіх нартах ён, мабыць, едзе,
Мой мілы хлопец Чорная Бяда?..

— Гэта ж цяжка так?—казаў я і браўся дапамагчы ёй. Праз некалькі хвілін кашуля мая стала мокрай ад поту. Сэрца калацілася, надзіміліся вены на скронях, але соромна было прызнацца, што я стаміўся, і я працаваў. А Тоня ўжо разразала тушу аленя, што прывезлі на абед пастухі, і спявала:

Патоне сонца ў халодным моры,
Паляцяць птушкі к далёкаму лесу,
І я адна застануся, адна.
Няўжо ты назад не прыедзеш?

— Ну што, стаміўся?—спачувальна пыталася яна, глянуўшы на мяне.—Табе з непрывычкі, праўда.

І, адклаўшы ўбок шкуры, разрэзаўшы мяса, яна брала сякеру.

Спрытна рассякаючы вузлаватыя карэнні яры, яна ўсміхалася мне. Сонца сярэбраным паўмесяцам ззяла на гранях яе сякеры, а яна спявала песню, не звяртаючы ўвагі на стому:

Паехаў мілы ад мяне,
Пакінуў мне ўсё...
Толькі няма
Ні губ яго, ні рук яго,
Ні поглядаў вачэй,
І беднаю я стала.

А да вечара было яшчэ далёка, і, перш чым ён надыходзіў, дзяўчына спявала так многа зрабіць, што здавалася, пасадзі яе ручнік выткаць, яна вытча ды яшчэ ўзоры на ім вышые.

Заходзіла сонца за горы Пай-Хоя, яна вярталася ў чум і шыла сабе пасаг.

Пімы жаніху яна ўпрыгожвала малюнкам рагоў аленя з чырвонага, сіняга і жоўтага сукна. З тонкай шкуры мёртванароджанага нерпяняці яна шыла непрамакаемы кісет для тытуню. Яна шыла сабе паніцу—накшталт футры з мяккіх белых шкур аленя і прыгажэйшай за яе паніцу я не бачыў ні адной на свеце.

Мяккі водбліск вогнішча падаў на шырокі твар дзяўчыны, на яе чорныя вочы, якія свяціліся ціхім агеньчыкам шчасця.

Яна шыла пасаг, час ад часу назіраючы за тым, як я запісваю ў сшытак легенду пра Ваулі Пізтаміну, якую праспявала мне ўчора сляпая казачніца Нярканэ.

(Заканчэнне на 4-й стар.).

ВЯСНОВАЯ МАЗАІКА

РЭПАРТАЖ, У ЯКІМ РАСКАЗВАЕЦЦА АБ НАВАПОЛАЦКІМ ПАЛАЦЫ КУЛЬТУРЫ, АБ АМАТАРЦЫ ТЭАТРА ТАНІ ШЫКУНОВАЙ, АБ КЛУБЕ «ДАНКА» І ЯГО ПРЭЗІДЭНЦЕ ВОВЕ ШЧАРБАКОВЕ, АБ АНСАМБЛІ «КОЛАС», АБ САЧЫНЕННІ ПРА РЫЖАГА САБАКУ І ПРА МНОГАЕ ІНШАЕ.

НАС ЧАЦВЁРА І ЯШЧЭ ШАФЁР ЛЁНЯ, ЯКІ МАЛА ГАВОРЫЦЬ, АЛЕ ГАЗУЕ НА 120

Мы пакідаем Віцебск у сем гадзін раніцы. Над горадам навісілі цяжкія чорныя хмары. Дзвіна больш не можа трымацца: з шумам, трэскам і скрогатам панёсся лёд насустрач вясне, сонцу...

Наш шлях не блізкі, не далёкі — у Наваполацк. Для мяне ён зусім новы — я еду туды ўпершыню, а для маіх спадарожнікаў, работнікаў Віцебскага абкома камсамола ён даўным-даўно знаёмы. Хоць і іх чакаюць сюрпрызы.

Замільгалі незнаёмыя назвы вёсак, раёнаў. І знаёмыя трапляюцца. Обаль, напрыклад. Не толькі ў Беларусі, але і ва ўсім Савецкім Саюзе добра ведаюць аб Обальскай падпольнай арганізацыі. Тут, у спецыяльным будынку, цяпер Рэспубліканскі музей камсамольскай славы. За два гады яго наведала 600 дэлегацый з усіх канцоў нашай краіны і з-за рубяжа.

Скорасць наводзіць на думкі аб часе, аб бясконцасці свету. Завязваюцца нейкія агульныя размовы, якія невядома якім чынам пераходзяць на першыя пралескі, на вуліцы Каіра, у якім давялося пабываць Тамары— нашай спадарожніцы.

Ды я забыла сказаць, што я еду знаёміцца з новым Палацам культуры нафтавікоў і яго работай, якая пачалася задоўга да адкрыцця Палаца. Горад узнік адразу, нечакана, ніякіх украін, вакол лес. Мы праязджаем міма новых будынкаў, новых магазінаў, сталовых, кінатэатраў, і спадарожнікі мае няспынна ўсклікаюць: «А вось гэтага ў мінулы прыезд не было!» І, гледзячы ў другое акно: «І вось гэтага, і вось гэтага!..»

ЛЁНЯ ЗАТАРМАЗІЎ. КАЖУЦЬ, НУЛЯВАЯ СКОРАСЦЬ — ТАКСАМА СКОРАСЦЬ, АЛЕ МЫ ЯЕ НЕ АДЧУВАЕМ І ВЫХОДЗІМ З МАШЫНЫ

У Палацы культуры — цішыня. Першы, з кім я пазнаёмілася, — Жорык, вучань трэцяга класа. Ён па-рэпарцёрску трымае на каленях сшытак і піша. Аказваецца ён чакае тату і піша сачыненне аб тым, як правёў выхадны дзень. Сачыненне, на мой погляд, атрымалася, хоць Жорык увесь час засмучаўся, што настаўніца можа паставіць яму «пару». Вось што ён напісаў: «Увесь дзень я гуляў з рыжым сабакам. Ён рыжы і разумны».

Жорык стаў маім гідам. Ён расказаў, што такіх палацаў у Беларусі няма, ды і наогул такіх палацаў больш нідзе няма, — вось паглядзіце самі. Ён бяжыць крыху папярадзе. Я кажу Жорыку, што, напэўна, у такіх палацах раней жылі цары. Ён ківае галавой і дадае: і цары-цы.

Мы моўчкі праходзім праз холы, залы, заглядваем у рэпетыцыйныя пакоі, аглядаем вестыбюль. Тут ёсць радыё- і кінабудкі, душавыя, буфеты, цудоўныя кабінеты для кіраўнікоў калектываў. Гэты Палац будавалі і афармлялі добрыя і таленавітыя людзі. Яны здолелі зрабіць так, каб у кожным памяшканні людзі адчувалі сябе лёгка, утульна і, я б сказала, крыху ўрачыста — вось так, як зараз мы з Жорыкам.

Глядзельная зала на 800 месц, ніякіх лішніх дэталяў — многа паветра, многа святла. У холах — зручная мэбля, кераміка, літыя чыгунныя ўпрыгожанні. У бібліятэцы— чытальная зала, дзе можна знайсці любую газету, любы часопіс. Мой маленькі гід адчувае сябе наследным прынцам. Ён з гордасцю крочыць побач, нібы ўсё тут належыць яму асабіста. Ён смешна і з замілаваннем дакранаецца да сцен, садзіцца ў крэсла, задзірае галаву і разглядвае свяцільнікі... і вядзе мяне ў цудоўную краіну свайго дзяцінства, якая так падобна на гэты Палац.

Калі мы развітваліся, я сказала Жорыку, што цяпер да свайго сачынення ён яшчэ можа прыпісаць расказ аб тым, як мы вандравалі з ім па Палацы. Але ў яго свае планы.

— Аб гэтым я напішу асобна,— крычыць ён мне і ўцякае.

Я заходжу ў кабінет дырэктара. На сцяне — партрэт Аляксея Баталава, любімага акцёра. Генадзь Пятровіч Галінскі, дырэктар Палаца культуры, захапляецца тэатрам і кіно, вядзе драматычны калектыў. Самадзейныя акцёры займаюцца пастаноўкай голасу, сцэнічным рухам, фехтаваннем, музыкай — усім, што неабходна акцёру. Вядзе Генадзь Пятровіч яшчэ і гурток чытальнікаў. Кажуць, здорава сам чытае Ясеніна. Мне не давялося яго пачуць. Але мая спадарожніца Анечка расказала, што ён выходзіць у чырвонай сарочцы (бо Ясенін пісаў, што чырвоны колер мацней за ўсе) і вельмі цікава, па-свойму, нікога не пераймаючы, з захапленнем чытае лірычныя і палымяныя, пявучыя і моцныя ясенінскія вершы.

«ГУЛЛІВЫЯ ЛАСТАЎКІ» І ІНШЫЯ КАЛЕКТЫВЫ, З ЯКІМІ Я ПАЗНАЁМІЛАСЯ У ГЭТЫ ВЕЧАР

Валодзю Ткачову 19 гадоў. Ён кіруе эстрадным аркестрам. Іх адзінаццаць. Пасля канцэрта мы разгаварыліся. Хлопцы ў асноўным працуюць на нафтаперапрацоўчым аператарамі, машыністамі, апаратчыкамі... Аркестр свой любяць — вось так (Валодзя паказвае рукой вышэй галавы), калектыў моцны, заўсёды разам. Аркестру аддаюць увесь свой вольны час. Зараз рыхтуюць канцэртную праграму.

Вядома, пазнаць за кароткі час хлопцаў з «Гуллівых ластавак» цяжка, і ўсё-такі сёе-тое я аб іх даведалася...

Віктар Маскоўскі, саксафаніст:

— Жывём— не сумуем, людзям служым, — жартуе ён, адказваючы на маё пытанне, ці не сумна ім у Наваполацку.

Валодзя Ткачоў:

— Часу не хапае. Падоўжыць бы суткі. Усё мяняецца, а суткі як былі 24 гадзіны, так і засталіся.

Яўгеній Шарыпа, кантрабас:

— Няўжо вы станеце пісаць пра нас, такіх звычайных? Між іншым, мне здаецца, што звычайных людзей становіцца ўсё менш. Час абудзіў вынаходнікаў, мысліцеляў. Згодны?

Зноў Валодзя Ткачоў:

— Рэпеціруем мала. Хацелася б кожны дзень.

Мне спадабаліся гэтыя адзінаццаць хлопцаў — вясёлыя, дасціпныя, дзёрзкія, якія «больш за ўсё на свеце любяць музыку». Мне ўдалося таксама пабываць на рэпетыцыі харэаграфічнай студыі, якую вядзе Слава Клічко, «малады, жыццярадасны, хлопец-зух» — так ахарактарызаваў яго мне Генадзь Пятровіч. У Палацы створаны народны хор і вакальны калектыў, духавы аркестр, клуб аматараў мастацтва і «Малышок», лялечны тэатр і хор хлопчыкаў. У творчых калектывах і аматарскіх аб'яднаннях ужо займаецца больш як 1000 чалавек.

На развітанне заглядваю ў невялікую залу. Ідзе пасяджэнне клуба «Данка». Ён аб'ядноўвае падлеткаў—аматараў паэзіі, фантазёраў і летуценнікаў. Сёння ў гасцях у іх—вершы паэта Сяргея Чакмарова. Як слухаюць!.. Ледзь-ледзь пагойдваюцца рыжыя, белыя, чорныя галоўкі. Вова Шчарбакоў аж забыў, што ён прэзідэнт клуба, заплюшчыў вочы і замёр. Можа, у такія хвіліны запальваюцца сэрцы, каб потым усё жыццё свяціць людзям.

ЗНОЎ МАШЫНА Ў ДАРОЗЕ. З НАВАПОЛАЦКА — У ПОЛАЦК, З ПОЛАЦКА — У ВІЦЕБСК

— У Віцебску няма аддзяленняў творчых саюзаў, гэта яшчэ наперадзе, — расказвае Тамара Ішчанка, другі сакратар Віцебскага абкома камсамола. — Вось мы і вырашылі стварыць аб'яднанне маладой творчай інтэлігенцыі. Ужо сёе-тое зроблена. Летась правялі цікавы семінар на Браслаўскіх азёрах, запрасілі паэтаў, акцёраў, кампазітараў з Мінска. Былі ў нас вельмі цікавыя гутаркі, вострыя спрэчкі... Тады ўсё і пачалося.

Ужо назаўтра, у Віцебску, Тамара паклала перада мной папку. У Тамары былі неадкладныя справы: да яе прыехалі людзі з вобласці, і я засталася з папкай сам-насам. Я адкрыла яе — перспектыўны план работы, у якім намечана стварыць статут і значок для членаў аб'яднання; прадугледжаны выезды ў раёны для аказання дапамогі пачынаючым літаратарам, кампазітарам і мастакам, паездкі членаў аб'яднання па збору вуснай народнай творчасці, прапаганда дасягненняў савецкага і сусветнага мастацтва, сустрэчы з віднымі дзеячамі літаратуры, культуры.

Былі ў папцы вершы паэтаў Д. Сімановіча і Н. Гвоздзікава, праграма канцэрта творчай моладзі Віцебшчыны, білеты, сяброўскія шаржы...

Прачытала я і такі дакумент: «Віцебскі абласны абком камсамола і савет абласнога аб'яднання творчай інтэлігенцыі просіць выдзеліць мастаку Г. Ш—у жыллёвую плошчу...»

Пазнаёмілася я і з людзьмі — членамі і стваральнікамі творчага аб'яднання: паэтам Давідам Сімановічам, будучым мастацтвазнаўцам Уладзімірам Рошчыным, акцёрам Баляславам Сяўко. Яны з захапленнем расказвалі аб будучым аб'яднання, аб тым, як карысны для людзей творчыя сустрэчы, абмен думкамі, сяброўская парада, а часам — і вострая крытычная заўвага.

НАША МАШЫНА МЧЫЦЦА ПА ВУЛІЦАХ ВІЦЕБСКА. СПЯШАЕМСЯ Ў ТЭАТР НА СПЕКТАКЛЬ «ЗЫКАВЫ»

Ох, і капрызная сёлета вясна. То снег, то дождж, то сонейка выгляне. А сёння вецер. Аж паветра размякла ад сырога пранізлівага ветру.

Наш шафёр Лёня парадкам стаміўся. Усё-такі больш за чатырыста кіламетраў адмахаў за два дні. Але ён малайчына, даставіў нас у час. Зайшлі ў залу — і святло пагасла.

У гэты вечар я пазнаёмілася з Таняй Шыкуновай — паклоннікам тэатра. Яна сядзела побач, і мы пазгаварыліся. Яна сказала, што Віцебскі тэатр — гэта яе родны дом, таму што яна ходзіць сюды з шасці гадоў. Да гэтага яна з маці жыла ў вёсцы і ў Віцебску трапіла ў тэатр першы раз у жыцці. Калі спектакль закончыўся, яна доўга плакала і не хацела пакідаць залу. Яе вывелі з умовай, што заўтра яна зноў прыйдзе. З таго часу Таня глядзіць усе новыя спектаклі і яе мама таксама. Тані шкада, што больш яна не плача, і усё спадзяецца, што здзейсніцца цуд і аднойчы віцябляне пакажуць такі спектакль, што зноў не захочацца выходзіць. Яна сказала, што марыць, каб у іх тэатры паставілі п'есы Б. Бээхта, што-небудзь пра Міхаіла Святлова. «А вам хочацца, каб паставілі п'есу пра Святлова?» — запыталася яна. Я сказала, што гэта было б здорава, але пра Святлова трэба напісаць вельмі, вельмі таленавіта. Яна згадзілася.

Захапленне мастацтвам — вось балай, самае характэрнае для людзей, з якімі мне давялося сустракацца на Віцебшчыне. Цікава, што апытанне, праведзенае сацыёлагамі сярод моладзі, паказала: на першым месцы захапленне мастацтвам, 86 працэнтаў...

— Многія хочуць у наш калектыў. Але мы выбіраем самых здольных.

— А астатнія?

— Становяцца пастаяннымі гледачамі.

Гэта — з дыялогу з кіраўніком вядомага на Віцебшчыне ансамбля «Колас», заслужаным дзеячам культуры Канстанцінам Канстанцінавічам Партным.

Выступленне ансамбля я бачыла напярэдадні ад'езду ў Наваполацк, і цяпер мне захацелася пабыць на рэпетыцыі. Якраз пачалася падрыхтоўка юбілейнай праграмы да 50-годдзя БССР і ў калектыве развучвалі народныя беларускія танцы, танцы народаў свету.

На рэпетыцыі чалавек 40. Канстанцін Партной — нязменны кіраўнік калектыву — і «бог і цар».

— І... раз, і... два.

Адна група адпачывае ў калідоры, другая — рэпеціруе. У Канстанціна Канстанцінавіча няма перадышак. Чатыры разы на тыдзень па дзве-тры гадзіны. Вось адкуль тая лёгкасць, артыстычнасць на сцэне. Рэпетыцыі рэпетыцыямі, але ёсць яшчэ і канцэрты. Летась іх далі восемдзесят, сёлета — пятнаццаць.

— Хочацца, каб святочная праграма была як ніколі цікавая, — гаворыць Канстанцін Канстанцінавіч. — Ці ўдасца, пакажа час. Але будзем вельмі старацца...

Я выйшла на вуліцу. Цямнела. Вясновы вецер грымеў дзесьці па дахах, купаўся ў лужынах.

І. ПІСЬМЕННАЯ.

ПА ДАРОЗЕ СА ШКОЛЫ

Фотаэцюд А. КАЛЯДЫ.

ДЗЕЦІ І ОПЕРА

Дваццаць разоў запаўняла глядзельную залу акруговага Дома афіцэраў, дзе ішлі спектаклі Маскоўскага дзяржаўнага дзіцячага музычнага тэатра, мінская дзятва. Як яе заспакоіць, як падрыхтаваць да пачатку прадстаўлення? На сцэну выходзіла адна з кіраўнікоў тэатра Ксенія Барысаўна Асколкава і простымі, зразумелымі словамі расказвала, што такое опера, як яе спускаць, як паводзіць сябе ў зале.

Наступае цішыня, гучаць першыя акорды увертюры, рассоўваецца заслона — і пачынаецца дзіва казкі. Тысяча дзіцячых твараў звернута да сцэны, вочы гараць увагай і цікавасцю, гледачы адказваюць на рэплікі дзеючых асоб, папярэджваюць добрых герояў супраць падкопаў злых, успрымаюць усё, што адбываецца на сцэне як сапраўднае. Гледзячы на ўсё гэта, пачынаеш глыбей разумець, якую высакародную справу зрабіла Наталля Ільінічна Сац, стварыўшы першы ў свеце дзіцячы оперны тэатр!

Мы многа гаворым аб цяжкасцях і недахопах эстэтычнага, асабліва музычнага выхавання дзяцей. Дзейнасць Маскоўскага дзіцячага музычнага тэатра — выдатны ўзор таго, як трэба весці эстэтычнае выхаванне падрастаючага пакалення, прывучаць юных слухачоў глядзець спектакль, успрымаць музыку.

У рэпертуары тэатра — оперы-казкі «Марозка» М. Красева, «Воўк і сямёра казлянят» М Каваля, «Тры таўстуны» М. Рубіна, «Беласнежка» Э. Калманоўскага, «Чырвоная шапачка» М. Раўхвергера (апошнія тры былі паказаны ў Мінску), балет «Доктар Айболіт» І. Марозава. Зварот да казкі зусім апраўданы. Дзеці казку любяць. Яны гатовы слухаць адну і тую ж многа разоў і, захопленыя перыпетыямі сюжэта, лёгка падначальваюцца ладу музычных вобразаў. Гэта і прывучае юных слухачоў успрымаць оперу.

Але, думаецца, абмяжоўвацца толькі казкамі не варта. Вельмі хочацца ўбачыць на сцэне дзіцячага опернага тэатра спектаклі, якія расказваюць аб жыцці савецкіх школьнікаў, аб піянерскім лагеры, дружбе, подзвігах юных герояў і г. д. У багатай савецкай дзіцячай літаратуры ёсць нямала твораў, якія так і просяцца на оперную сцэну, ды опер такіх амаль няма. Для Маскоўскага дзіцячага музычнага тэатра пішуць зараз новыя творы на сучасныя сюжэты кампазітары Д. Кабалеўскі і Ц. Хрэннікаў. Будзем спадзявацца, што гэта будуць добрыя оперы і добрыя спектаклі.

Трэба вітаць ініцыятыву кіраўнікоў маскоўскага тэатра—прамую сувязь з кампазітарамі, зацікаўленасць у стварэнні новага рэпертуару. Прыклад гэты варты пераймання.

Работа тэатра нярэдка выходзіць за рамкі пастановак дзіцячых опер і балетаў. Аркестр тэатра даволі часта дае самастойныя канцэрты, часам тэатралізаваныя, прывучаючы дзяцей слухаць і разумець сімфанічную музыку. У праграмах канцэртаў — балетная музыка Чайкоўскага, сімфанічная казка «Пеця і воўк» Пракоф'ева (напісаная, як вядома, кампазітарам па ідэі Н. Сац), музыка Ільі Саца з праслуханага спектакля Маскоўскага Мастацкага тэатра «Сіняя птушка». Гэтыя канцэрты суправаджаюцца даступнымі для дзяцей, таленавіта напісанымі анатацыямі, якія чытае нярэдка сама Наталля Ільінічна Сац. Можна толькі шкадаваць, што такіх канцэртаў нашы госці не далі ў Мінску.

Аўтару гэтых радкоў давялося паглядзець два спектаклі — музычную камедыю Эдуарда Калманоўскага «Беласнежка» і оперу Міхаіла Раўхвергера «Чырвоная шапачка». Абодва спектаклі — гэта, як відаць, уласцівы ўсім работам тэатра,—вылучаюцца высокай рэжысёрскай і музычнай культурай. Апошняе асабліва важна. Сінтэтычныя прыёмы акцёрскай ігры, якія ўключаюць танец, буфанаду, нават цыркавую акрабатыку,—у спектаклі для дзяцей усё гэта проста неабходна! — не перашкаджаюць маладым акцёрам тэатра спяваць свабодна, выразна, артыстычна. Тэатр шукае — і ўжо ў многім знайшоў—свой стыль акцёрскай ігры, сцэнічных паводзін, дэкарацыйнага афармлення, рэжысёрскага вырашэння спектакляў.

Вельмі радуе ў большасці акцёраў дакладная і выразная дыкцыя—да юных слухачоў даходзіць кожнае слова, што вельмі істотна.

Невялікі па колькасці музычны аркестр тэатра іграе мякка, празрыста, не заглушаючы спеваку, а ў сімфанічных эпізодах паказваючы шчодрую разнастайнасць фарбаў і адценняў.

У агульным высокім музычным ладзе спектакляў немалая заслуга дырыжораў Л. Гершковіча і Л. Якаўлева. Хочацца асабліва адзначыць выразную, тонкую і дакладную манеру дырыжыравання, з якой Л. Гершковіч вядзе спектакль «Чырвоная шапачка».

Музыка М. Раўхвергера—кампазітара, які многа і паспяхова піша для дзяцей, — вельмі вобразная, канкрэтна-выразная. Запомніўся цэлы рад музычных эпізодаў: арыі Чырвонай Шапачкі і Зайца, дуэт Чырвонай Шапачкі і Мамы, марш «Зайцы-братцы», фінальная песенька. Трапныя музычныя характарыстыкі дадзены Воўку, Мядзведзю, Лісу, Пеўню.

Менш удалай здалася музыка «Беласнежкі» Э. Калманоўскага, вядомага як аўтара многіх добрых песень і музыкі, прыгожай, лёгкай. А ў дзіцячай аперэце «Беласнежка» кампазітар, як здаецца, зрабіў крыху большы акцэнт на слове «аперэта» і крыху меншы — на слове «дзіцячая». А хацелася б, каб было наадварот. Калманоўскаму, калі ён прадоўжыць работу для дзіцячага тэатра, яшчэ трэба знайсці спецыфіку музыкі, разлічанай на дзіцячае ўспрыняцце.

Але і ў «Беласнежцы» ёсць нямала прывабнай музыкі: марш гномаў, музыка лясного балю, рэчытатывы Каралевы і Люстэрка.

У тэатры працуюць маладыя і добрыя артысты — энтузіясты сваёй справы. Вельмі добрае ўражанне пакінулі І. Лапцева — Беласнежка, В. Тучынскі—гном Нядзеля, Н. Макарава — Каралева, В. Кірын—Галоўны выканаўца каралеўскіх жаданняў («Беласнежка»), Г. Пятровіча — Чырвоная Шапачка, В. Кірын—Заяц, В. Салавянаў — Мядзведзь («Чырвоная шапачка»). Не ўсё, аднак, было дасканала. Не справілася, у прыватнасці, з роллю — спяваннем і акцёрскай ігрой—Н. Макарава (Ліс у «Чырвонай шапачцы»). Але ў цэлым акцёрскія ансамблі ў абодвух спектаклях былі добрыя.

...Спектакль закончаны, дзеці выходзяць у фае. А там на століку — паштовая скрынка і заклік: «Пішыце, дзеці, пісьмы героям нашых казак!» І дзеці пішуць пяшчотныя пісьмы: «Добры дзень, Беласнежка! Ты вельмі добрая і прыгожая. Мне спадабалася, як ты спяваеш. А я стараюся вучыцца добра!»; «Баязлівы Заяц! Будзь больш храбры!»; «Дарагі Заяц! Віншую цябе: ты перамог Воўка і Ліса». Відаць, што спектаклі масквічоў, якія прайшлі з вялікім поспехам, пакінулі ў душах юных гледачоў прыкметны і моцны след.

Але міжволі падумалася: Маскоўскі дзіцячы музычны тэатр—пакуль адзіны ў свеце; наўрад ці можна спадзявацца, што тэатр такога ж профілю з'явіцца хутка і ў Мінску. А выхоўваць дзяцей, прывучаць іх да оперы трэба. Сёе-тое робіць наш Вялікі тэатр. Успомнім пастаноўкі опер «Марынка» Р. Пукста і «Кошчын дом» І. Польскага. Але гэтага яўна мала; тэатр павінен пашырыць свой дзіцячы рэпертуар. Бо ёсць і іншыя дзіцячыя оперы беларускіх кампазітараў: «Рукавічка» М. Чуркіна, «Мыйдадзір» А. Янчанкі. Не грэх будзе выкарыстаць і творы з рэпертуару масквічоў, можна ўспомніць таксама дзіцячыя оперы Ц. Кюі і М. Лысенкі. Трэба, нарэшце, зацікавіць гэтым жанрам маладых беларускіх кампазітараў.

А маскоўскім гасцям скажам: дзякуй за высокае мастацтва, за цудоўны ўрок! Прыязджайце яшчэ, прывозьце новыя дзіцячыя оперы і балеты, прывозьце вашы сімфанічныя праграмы. Беларуская дзятва будзе вам рада!

Л. АЎЭРБАХ.

МУЗЕЙ ПАД ЗОРКАМІ

Вучоныя, мастацтвазнаўцы, архітэктары Казахстана абмяркоўваюць зараз праект своеасаблівага архітэктурнага музея пад адкрытым небам. Яшчэ не прынята канчатковага рашэння, стварэць яго дзесьці ў ваколіцах сталіцы рэспублікі, у адным з яе паркаў, або на тэрыторыі новага комплексу Казахскай мастацкай галерэі імя Шаўчэнкі, які будуецца ў Алма-Аце. Аднак неабходнасць арганізацыі такога музея зараз прызнаецца ўсімі.

— Невялікія па аб'ёму помнікі казахскай нацыянальнай культуры, якія ўяўляюць сабой выключна высокую мастацкую і культурна-гістарычную каштоўнасць, раскіданы на велізарных прасторах пустынь, паўпустынь і сухіх стэпаў, — расказвае старшыня Саюза архітэктараў Казахстана Русцем Сейдалін. — Большая іх частка знаходзіцца ў аддаленых месцах, дзе рэдка бываюць людзі. Гэта тлумачыцца тым, што казахі на працягу вякоў былі народам качавым, які не меў адзінага культурнага цэнтра. Сабраць самыя каштоўныя з гэтых помнікаў у адным месцы азначала б даць магчымасць шырокаму колу людзей пазнаёміцца з усімі багаццямі старажытных мастацкіх традыцый, талентам і майстэрствам народных умельцаў. Неабходнасць стварэння музея прадыктавана таксама тым, што каменныя статуі — гэтыя славутыя «стэпавыя бабы», магільныя помнікі, маўзалеі і іншыя архітэктурныя помнікі, якія знаходзяцца часам у сотнях кіламетраў ад населеных месц, напрыклад, на Мангышлаку, Усцюрце або Бетпакдале, надзвычай цяжка паставіць пад дзейсную ахову дзяржавы і тым самым зберагчы іх для будучых пакаленняў.

Будучы архітэктурны музей адыграе вялікую ролю і ў вырашэнні важных практычных пытанняў. Госці Алма-Аты заўсёды звяртаюць увагу на тое, як удала ў архітэктуры новых грамадскіх і жылых будынкаў казахстанскай сталіцы спалучаюцца нацыянальныя традыцыі і сучасны стыль. Новы музей стане для маладых архітэктараў як бы своеасаблівым «наглядным дапаможнікам», крыніцай новых ідэй.

Цікава, што ў новы будынак Казахскай карціннай галерэі мяркуецца ўманціраваць некалькі каменных статуй, тыповых для казахскіх стэпаў. Яны будуць арыгінальным упрыгожаннем сучаснага па сваёй архітэктуры будынка.

Што ж датычыцца архітэктурнага музея, дык, як паведаміла карэспандэнту АДН інспектар аддзела па ахове помнікаў Міністэрства культуры Казахскай рэспублікі Муза Рыбакова, адпаведны праект учо распрацоўваецца міністэрствам.

Юрый ЗЯНЮК (АДН).

Па знойдзеных скарбах Беларусь займае адно з першых месц у краіне. Зарэгістравана 1300 скарбаў, знойдзеных на тэрыторыі нашай рэспублікі.

У канцы 1966 года два цікавых скарбы былі знойдзены ў вёсцы Гараўляны Глыбоцкага раёна. Дацэнту гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта В. Рабцэвічу ўдалося высветліць, што скарб быў захаваны на месцы старажытнага паселішча ў XI стагоддзі. Скарб складаюць манеты арабскага Усходу і Еўропы таго часу.

На здымку — гараўлянскі скарб.

Фота І. ЗМІТРОВІЧА.

З архіўных паліц

СУВЯЗНЫ ГЕРЦЭНА

...У распісцы значыцца: «У турэмны замак прыняты ад Мінскага губернскага ўпраўлення арыштант Уладзімір Трувелер».

Хто ён, гэты чалавек? Уладзімір Трувелер, быў юнкерам 23-га флоцкага экіпажа. На фрэгаце «Алег» ён плаваў у Англію, дзе ў той час знаходзіўся ў эміграцыі А. Герцэн. Яны пазнаёміліся. І Трувелер пачаў тайна перавозіць у Расію палітычную літаратуру. Адначасова юнкер вёў рэвалюцыйную прапаганду сярод матросаў, распаўсюджваў вядомую газету Герцэна «Колокол». Распаўсюджваў між іншым і ў Беларусі.

Трувелер прыязджаў у Магілёў, дзе жыла яго маці. Тут ён сустракаўся з беднымі сялянамі і агітаваў выступаць супраць памешчыкаў, збіраў матэрыялы для «Колокола», затым тайна перавозіў іх у Лондан. Аднойчы ён прывёз з сабой на Магілёўшчыну нумар газеты (№ 52 за 1859 г.), дзе была змешчана нататка, у якой выкрываліся зверскія здзекі памешчыка са сваіх прыгонных сялян. «Ці праўда, што старшыня палаты ў Магілёве пан Стахоўскі, — пісалася ў запытальнай форме,—надзяваў сваім прыгонным жанчынам намордніку, калі яны збіралі садавіну ці гародніну, з мэтай разважнага папярэджвання спакусы да гароху ці моркаўкі? Гэта было не ў 1657, а ў 1857 годзе. Кажуць, быццам праводзіцца следства дзеля ўтойвання гэтай справы. Той, хто пісаў нам, дадае, што калі спатрэбіцца, ён гатовы падмацаваць сваім імем расказ».

Прозвішча аўтара пад нататкай з Магілёўшчыны не было пастаўлена. Але вельмі магчыма, што аўтарам гэтага матэрыялу быў Уладзімір Трувелер.

Трувелера арыштавалі ў Магілёве, куды ён апошні раз прыязджаў да маці на адпачынак. Судзіў сувязнога Герцэна ваенны суд за распаўсюджванне палітычных адозваў. Яго хацелі пасадзіць у Мінскую крэпасць. Аднак імператар загадаў саслаць паплечніка Герцэна «на паселенне ў Сібір..., устанавіць тайны нагляд за ім і штогод паведамляць кіраўніку марскога камандавання аб паводзінах і поглядах Трувелера».

У ссылцы з яе жорсткім рэжымам нявольнік цяжка захварэў. Ён хадайнічаў аб пераводзе туды, дзе ёсць магчымасць лячыцца кумысам. Такім месцам быў Курган. Прыехаўшы ў гэты зауральскі гарадок, Трувелер адразу ўключыўся ў грамадскае жыццё ссыльных паўстанцаў Польшчы, якіх падтрымліваў Герцэн.

Аднак хвароба абвастрылася. Па хадайніцтву маці, якая пераехала з Магілёва ў Пецярбург, хворага аддалі на яе ўтрыманне, пад строгі паліцэйскі нагляд.

М. ЖЫГОЦКІ.

ДЗЯЎЧЫНА З РАКІ СЮРЭМБОЙ-ЯГА

(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.)

Адклаўшы на момант шыццё, дзяўчына гаворыць спачувальна:

— Цяжкая ў цябе работа, таварыш.

Яна ўздыхнула і, памаўчаўшы хвіліну, дадала:

— Хлапец у мяне ёсць. Там, далёка...—Яна няпэўна махнула рукой.—У вярхоўях Сюрэмбой-Ягі жыве пастух, Яптэко яго зваць. Ён яшчэ ў шахматы добра гуляе. Лепш за ўсіх у тундры.

Дзяўчына памаўчала і зноў уздыхнула.

— Я яму два тыдні пісьмо пісала. Галава ў мяне вельмі разбалелася. Я заплакала і кінула пісьмо ў агонь. Не атрымліваецца. Цяжкая ў цябе работа, таварыс...

Я паглядзеў на дзяўчыну, і нечаканая думка прыйшла мне ў галаву. Я прапанаваў ёй прадыктаваць мне пісьмо да Яптэко. Дзяўчына сарамліва сказала:

— Я хацела папрасіць цябе, ды баялася... Напішы, а я сама перакладу на паперу...

Не адкладваючы справы надалей, я ўзяўся за пісьмо. Я прызнаўся ў каханні Яптэко, і дзяўчына з гордасцю паглядзела на мяне.

— Бач ты які!—сказала яна.—Ад тваіх пісем многа дзяўчат, напэўна, плачуць. Закахаюцца і плачуць...

І ўсю ноч яна перапісвала алоўкам пісьмо.

— Я яго і другі раз пашлю, вельмі ўжо яно добрае,—сказала яна.

Я растлумачыў ёй, што так не трэба рабіць, і напісаў ёй яшчэ тры пісьмы да Яптэко Манзадзя. Кожнае пісьмо я пранумараваў, каб яна не перабылтала і не паслала больш пяшчотнае пісьмо раней, чым гэта трэба было.

(Пазней я даведаўся, што, пасылаючы пісьмы, дзяўчына старанна ставіла на іх і нумар, пастаўлены мною).

Раніцай я развітаўся з Тоняй Вылко. Я ўзяў з сабою, каб адаслаць, пісьмо да Яптэко Яна, збянтэжаная і ўсхваляваная, праводзіла мяне да трэцяй сопкі.

— Шкада,—сказала яна,—стаў бы на ўлік у нашу арганізацыю, і мы б цябе нават сакратаром райкома выбралі. Ты сардэчны таварыс, праўда?

— Праўда,—сказаў я,—мне і трэба быць такім.

Але дзяўчына не зразумела маёй іроніі. Яна сумна паглядзела на небасхіл, на раку Сюрэмбой-Яга, якая імчала свае воды міма стойбішча яе любага хлопца.

— Вось бачыш,—сказала яна,—ты і сам разумееш гэта,—і змоўкла.

— Ну, бывай,— сказаў я, каб замяць няёмкае маўчанне,— бывай...

— Ты, можа, яшчэ прыедзеш да нас з Масквы? Га? Я ўжо тады замужам буду...

Дзяўчына зноў змоўкла і, прысеўшы на нарты, задуменна і паспешліва прашаптала:

— Няхай Яптэко ў раку трэсачак накідае. Праз дзень яны даплывуць да мяне. Я буду глядзець, ці атрымаў ён пісьмо... Калі ён мяне кахае, то няхай накідае трэсачак у раку... Добра?

— Добра, — сказаў я і, паціснуўшы руку дзяўчыне, крануў запрэжку.

Спусціўшыся ў даліну, я азірнуўся. Дзяўчына стаяла на вяршыні сопкі, махала мне рукой. Сонца стаяла ззаду яе, добрае чэрвеньскае сонца, і ветрык даносіў да мяне яе развітальныя словы:

— Да па-ба-чэн-ня, та-ва-рыс!..

Вечарам я ўбачыў Яптэко. Ён сядзеў у чуме ля кастра і стругаў планачкі.

— Пашку сыну раблю, — сказаў ён, — бразготку сыну.

З маленькіх планачак Яптэко без адзінага цвіка, адным нажом рабіў бразготку. Гэта была хітрая работа. Драбінка ляжала побач з ім на дошках. Колькі цярпення патрэбна было для таго, каб зрабіць такую пашку?

— Паўгода ўжо раблю, — сказаў Яптэко.

— А дзе сын? — здзіўлена запытаў я.

— Сын будзе, — упэўнена адказаў, Яптэко,— ажанюся, вось і будзе.

Ён задумаўся і сказаў:

— Дзяўчына мяне кахае. Тоняй Вылко яе завуць. Добрая дзяўчына. Толькі...

Яптэко замяўся.

— Я, разумееш, таварыш, кахаю другую... Настаўніцу нашу, Тоню Кавылёву... Я моцна яе кахаю, і мне цяжка ад гэтага... А ты кахаеш каго-небудзь?

— Не, — сказаў я.

— Вось бачыш, — сказаў, уздыхнуўшы, Яптэко, — а я кахаю... І ён ужо больш не гаварыў са мной.

Перад сном я перадаў яму пісьмо і просьбу дзяўчыны з ракі Сюрэмбой-Яга.

Я не спаў усю ноч, прабуючы здагадацца аб настроі Яптэко, але ён прачытаў пісьмо, твар яго стаў сумны, і ён лёг спаць.

Але і раніцай ён не кінуў у раку трэсачак.

Сум агарнуў мяне. Я згроб ад кастра цэлую кучу трэсак і выйшаў з чума.

Я доўга стаяў на беразе ракі, і мне было цяжка. Мне было вельмі цяжка, і я кінуў у раку трэсачкі.

Да іх жа дакраналіся рукі Яптэко, любага хлопца Тоні Вылко, дзяўчыны з ракі Сюрэмбой-Яга.

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, Г. М. БУРАЎКІН (намеснік галоўнага рэдактара), А. І. БУТАКОЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, Т. А. ДУБКОВА, Г. М. ЗАГАРОДНІ, В. Ул. ІВАШЫН, А. М. КАШКУРЭВІЧ, В. Б. ЛАДЫГІНА, П. М. МАКАЛЬ, А. Н. МАРЦІНОВІЧ, Р. К. САБАЛЕНКА, І. А САНКОВА, З. Ф. СТОМА, М. Г. ТКАЧОЎ, Р. Р. ШЫРМА.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ:

г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмная рэдакцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказнага сакратара — 3-44-04, аддзела